**№№101–102**
**(3438–3439)**

8 ліпеня 2011 г.

Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец: УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

# Народная Воля

*На прастор, на шырокі разлог*
*Выхадзі, мой народ, грамадою...*

**Якуб КОЛАС**

**Да ўвагі!**
*Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!*

СКАЗАНО!



*Александр ЛУКАШЕНКО:*

## «Если в ЕС их хотят к себе забрать — завтра билет выпишем и отправим»

Вчера, посещая Шклов, Александр Лукашенко заявил, что не намерен торговаться с Евросоюзом относительно заключенных.

— Что касается политзаключенных, вы также знаете, что у нас нет сегодня статьи политзаключенных, — цитирует Лукашенко БЕЛТА. — Это им этого хочется. Честно говоря, я не знал, сколько у нас осужденных по этим беспорядкам и находится в местах заключения. Из 600 привлеченных тогда у нас 28 или 30 человек находились в местах не столь отдаленных, кто условно, кто в тюрьме. Но там, где есть неопровержимые факты, снятые в том числе и западными журналистами.

Лукашенко заметил, что в Шклове есть колония, зона усиленного режима. "Этим шалопаям там делать нечего. Если они туда попадут, то их в течение недели быстро призовут к порядку. Поэтому я их даже боюсь там держать, потому что скажут, что там власть издевалась над ними".

— Торговаться я ни с кем не намерен. Это люди — плохие они, хорошие, — это человеческие судьбы. Торговаться с ЕС и разменивать этих людей на какие-то переговоры и разговоры, нам это не надо абсолютно, я говорю искренне, — заявил Лукашенко. И продолжил:

— А если в ЕС их хотят к себе забрать — завтра билет выпишем и отправим, не вопрос. Пусть забирают, если они такие радетели по политзаключенным. Завтра в один вагон посадим — я приму решение — всех, и даже тех, кто сегодня остался на свободе и мычат на площадях, они специально провоцируют. Всех, за кого они радеют, завтра в вагон — и туда. Если быстрее — самолет выделим, перебросим мгновенно, пусть забирают. Но вот увидите, как они на это отреагируют.

СПЕЦЫЯЛЬНЫ РЭПАРТАЖ

# «На запіс прыходзьце ў тры ночы...»

*Учора карэспандэнт "Народнай Волі" ў чарговы раз адправіўся ў Мінску на пошукі валюты і высветліў, што яго чарга ў абменным пункце на Чыгуначным вакзале можа падысці праз 2 гады і 8 месяцаў.*

З месяц таму я абышоў абменныя пункты ў сталічным мікрараёне "Малінаўка". Вынік быў сумны — чэргі, чэргі, чэргі...

Але ж улады абяцалі, што пасля 1 ліпеня сітуацыя зменіцца. Аўтааматары перасталі вывозіць валюту за мяжу, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што *"пасля 1 ліпеня мы пойдзем больш спакойна, хутчэй, больш упэўнена".* Я таксама ўпэўнена пайшоў па абменніках, на гэты раз выбраўшы цэнтр горада.




**Аддзяленне "Белінвестбанка" (вуліца Кірава, касы стадыёна "Дынама").** У банку нікога няма, у баку малады хлопец папівае каву.

— Перада мной яшчэ адзін чалавек, — інфармуе мяне. — Кожны можа на рукі купіць не больш за 700 долараў, хоць яшчэ дзень таму можна было не больш за 500. Але здаюць слаба — за некалькі гадзін толькі 60 расійскіх рублёў купіў.

**Аддзяленне "Белінвестбанка" (вуліца Кірава, 3).** Тры чалавекі ў чарзе, якія, як толькі мяне заўважылі, адразу замітусіліся і пачалі расказваць "жахі свайго гарадка".

— Не варта тут займаць чаргу, — адгаворвае адзін. — Я з красавіка толькі тысячу "баксаў" купіў. Калі табе трэба 300 долараў, то некалькі месяцаў будзеш чакаць. Ідзі на вакзал, там тысячу за хвіліну могуць здаць.

**Аддзяленне "Беларусбанка" (у будынку Чыгуначнага вакзала).** Гэта, напэўна, самае "хлебнае" месца ў Мінску. У сталіцу прыязджае шмат замежнікаў, і натуральна, што мяняюць грошы яны адразу ж на вакзале. Але і чарга тут — ого-го! Мяне запісваюць у сшытак 656-м.

— Адзначацца будзеце прыходзіць раз у тыдзень, — тлумачыць жанчына, якая вядзе "талмуд". — Можна набыць толькі тысячу долараў альбо любой іншай валюты на такую ж суму.

— Як рухаецца чарга?

— Дзесьці па два-тры чалавекі за дзень. Увогуле ж, з канца красавіка, калі сфарміраваўся спіс, прайшло ўсяго 38 чалавек.

У галаве спрацоўвае калькулятар: за два месяцы прайшло 40 чалавек, значыцца, мая чарга, калі сітуацыя застанецца ранейшай, падыдзе праз 32 месяцы.

**Аддзяленне "Беларусбанка" (у гандлёвым цэнтры "Сталіца")**. Тры жанчыны кажуць, каб прыходзіў запісвацца ў чаргу ў 10 гадзін вечара. Чарга — 400 чалавек, можна купіць 700 долараў. У дзень праходзіць па 2—3 чалавекі.

**Аддзяленне "Беларусбанка" (у гасцініцы "Мінск" з боку касцёла).** Дзіва дзіўнае! Ля абменнага пункта ніводнага чалавека!

— Няма ні чаргі, ні валюты, — разводзіць рукамі касірка. — За апошнія дні ніхто ні здаў ні цэнта.

**Аддзяленне "Белінвестбанка" (у ГУМе)**. Са здзіўленнем даведаўся, што ў гэтым месцы сфарміравалася свая "дзяржава ў дзяржаве".

— У чарзе 19 чалавек, але мы вас не запішам, — катэгарычна адрэзала мне жанчына, якая прадставілася "кантралёрам".

— Чаму?

— Таму што нават сваіх блізкіх не запісваем. Тут усе прадпрымальнікі, мы працуем пастаянна. І ўвогуле, запіс у панядзелак у тры ночы.

— А чаму менавіта ў тры ночы?

— Ды вы што! — шэпча мне на вуха хлопец і азіраецца па баках. — Мы тут наогул як у "гарачай кропцы". Цэнтр горада, акцыі праходзяць ля ГУМа, нам сказалі, каб больш за трох не збіраліся. На пастаяннай рызыцы, у любы момант могуць забраць...

Ну, кажу, хто не рызыкуе, той не п'е шампанскае. І пакідаю ў спакоі жадаючых набыць валюту.

**Аддзяленне "Беларусбанка" (ля ГУМа, у падземным пераходзе).** Запіс у 21.00, у чарзе — 100 чалавек. Можна купіць 300 долараў, у дзень праходзяць 1—2 чалавекі.

**Аддзяленне "BelSwiss-Bank" (ля ўніверсама "Цэнтральны").** Малады чалавек распавядае мне, што ў чарзе 8 чалавек, набываюць па 200 долараў на брата. Адна нязручнасць: калі падыходзіць чарга, то дзяжурыць трэба ўсю ноч. "За тыдзень купіш", — супакойвае мяне суразмоўца.

Такім чынам, як не было да 1 ліпеня валюты ў абменных пунктах, так яна не з'явілася і пасля. Застаецца толькі чакаць у чэргах і далей слухаць "песні" чыноўнікаў...

**Алесь СІВЫ.**

**ДАРЭЧЫ**

## *А што казалі і кажуць па "валютным пытанні" нашы чыноўнікі?*

**31 сакавіка 2011 г.**
**Віцэ-прэм'ер Беларусі**
**Сяргей РУМАС:**

— Думаю, што калі не з заўтрашняга дня (1 красавіка), то, напэўна, з панядзелка сітуацыя павінна змяніцца, — паведаміў віцэ-прэм'ер "Комсомольской правде" в Белоруссии". — Я ведаю, што Нацыянальны банк сёння (31 сакавіка) разглядае гэтае пытанне. Цяжка сказаць, якое рашэнне будзе прынята. Але прыняцце любога з тых варыянтаў, якія разглядаюцца, прывядзе да таго, што фізічныя асобы змогуць набываць валюту.

— Долары ў абменніках з'явяцца?

— Думаю, што так... Альбо з заўтрашняга дня, альбо з панядзелка.

**22 красавіка 2011 года.**
**Прадстаўнік Нацыянальнага банка Беларусі Анатоль МАРОЗ:**

— Наяўная валюта можа з'явіцца ў абменных пунктах у маі, — заявіў начальнік Галоўнага ўпраўлення валютнага рэгулявання і валютнага кантролю Нацбанка Беларусі.

— Мы чакаем знешніх пазыкаў. У першую чаргу праведзены перамовы з Расійскай Федэрацыяй. Яна запатрабавала ад нас праграму мер па выхадзе з крызісу, якая ўжо прадастаўлена. На наступным тыдні, а можа быць і ў маі, гэта пытанне павінна быць вырашана. Пасля гэтага будуць прадпрымацца ўсе крокі па стабілізацыі валютнага рынку... 3800 рублёў за долар — гэта адэкватная ацэнка. Той курс, які зараз выстаўляецца на пазабіржавым рынку, завышаны.

**6 ліпеня 2011 года.**
**Віцэ-прэм'ер Беларусі**
**Сяргей РУМАС:**

На нядаўняй сустрэчы з працаўнікамі МАЗа віцэ-прэм'ер заявіў, што задача ўрада і Нацыянальнага банка — *"у трэцім квартале выйсці на раўнаважны курс беларускага рубля і забыцца аб праблемах на валютным рынку назаўсёды"*, паведамляе БелаПАН.

**12 лістапада 2010 года.**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА:**

*"Ніякай дэвальвацыі мы не плануем",* — заявіў А.Лукашэнка падчас гутаркі з жыхарамі Барысава, паведамляў interfax.by. Па словах кіраўніка краіны, шум вакол быццам бы плануемай дэвальвацыі *"паднялі шарлатаны, якія рвуцца ў прэзідэнты, для іх чым горш у краіне, тым лепш".*

А.Лукашэнка таксама заклікаў быць асцярожнымі з пераводам сваіх зберажэнняў у амерыканскія долары. *"Будзьце асцярожнымі з доларам. Я вас папярэдзіў,* — сказаў ён. — *Майце на ўвазе, што вы можаце згубіць на гэтым долары. Усе* (у свеце. - "**Інтэрфакс"**) *скідваюць долары, а вы яго скупляеце..."*

...Як кажуць, без каментарыяў.

## *Еўропа зноў заклікае вызваліць палітвязняў*

У Бялградзе працуе 20-я сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ. У межах сесіі плануецца абмеркаваць 25 рэзалюцый, у тым ліку аб выкананні правоў чалавека ў Беларусі.

На сесіі прысутнічае афіцыйная беларуская дэлегацыя на чале з віцэ-спікерам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктарам Гумінскім. Праект рэзалюцыі па Беларусі будзе абмяркоўвацца ў суботу, 9 ліпеня, паведамляе прэс-служба ПА АБСЕ.

### Што ўтрымліваецца ў праекце рэзалюцыі па Беларусі?

Парламенцкая асамблея патрабуе ад улад правесці незалежнае міжнароднае расследаванне інфармацыі пра катаванні ў беларускіх турмах.

Дакумент заклікае Беларусь дапусціць на сваю тэрыторыю незалежнага эксперта, прызначанага АБСЕ пасля звароту да "Маскоўскага механізму", для бесперашкоднага пачатку і правядзення сваёй працы.

Праект рэзалюцыі ўтрымлівае таксама патрабаванне неадкладна вызваліць усіх затрыманых за ўдзел у дэманстрацыі 19 снежня 2010 года, якіх ПА АБСЕ лічыць палітычнымі зняволенымі.

Акрамя усяго, ПА АБСЕ мае намер заклікаць афіцыйны Мінск да цеснага супрацоўніцтва з прадстаўніком АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ для вырашэння праблем, звязаных з пагрозай закрыцця незалежных СМІ, і распрацаваць заканадаўства пра СМІ ў духу прынцыпаў АБСЕ.

У рэзалюцыі выказана надзея на тое, што беларускія ўлады не адновяць рэпрэсіі супраць праваабаронцаў і надалей не будуць забараняць мірныя дэманстрацыі і сходы.

Аўтары праекта рэзалюцыі заклікаюць улады Беларусі спыніць пераслед, запалохванне і рэпрэсіі членаў апазіцыйных палітычных партый у форме звальненняў з працы і выключэння з універсітэтаў.

ПА АБСЕ выказвае шкадаванне з нагоды пераследу беларускіх НДА і заклікае афіцыйны Мінск спрасціць працэс іх рэгістрацыі.

**Таццяна КАРАВЯНКОВА, БелаПАН.**

ВІЗІТ

## *Нефтяной след визита Мясниковича*

Глава белорусского правительства Михаил Мясникович в четверг отправился с визитом в Азербайджан. Пожалуй, в биографии белорусского премьера еще не было визитов, к которым было приковано такое большое внимание за пределами нашей страны.

Беларусь, как известно, всегда работала с российской нефтью, и российские же нефтяные компании всегда претендовали на покупку наших НПЗ. Более того, переговоры на эту тему велись с российскими нефтяниками. И вдруг накануне визита Михаила Мясниковича в Баку белорусский посол в Азербайджане Николай Пацкевич "проговаривается", что Беларусь готова предложить Азербайджану акции двух имеющихся нефтеперерабатывающих заводов — и Мозырского НПЗ, и "Нафтана". *"Если у Азербайджана будет интерес покупать активы наших НПЗ, то — пожалуйста,* — сказал посол. — *Мы уже давно обратились к Азербайджану с уведомлением о том, что открыты инвестиции из Азербайджана".*

В воздухе тут же повис вопрос: рискнет ли Алиев ссориться с Кремлем из-за белорусских НПЗ?

Ильхам Алиев долго паузу держать не стал и заявил, что Азербайджан готов принять участие в покупке белорусских нефтяных активов. Более того, уже заявлено, что покупателем части белорусских НПЗ может стать Государственная нефтяная компания Азербайджана (ГНКАР). Компания заинтересована в развитии нефтепереработки, имеет программу по вложению инвестиций в объеме 20 миллиардов долларов, которые планирует потратить на скупку активов в России, Казахстане, Европе. Почему бы не присоединить к этому списку Беларусь, если предложение само идет в руки? Раньше ведь никто и подумать не мог, что Беларусь рискнет разгневить Кремль и сорвать поставки российского сырья, предложив белорусские НПЗ другому партнеру. Но вон оно как получилось!

Эксперты в нефтяной отрасли отмечают, что Ильхам Алиев сейчас более всех других лидеров стран СНГ независим от России и поэтому может позволить себе геополитические вольности на тех территориях, которые Кремль традиционно рассматривает в качестве своих сателлитов. Однако у экспертов нет единого мнения по поводу того, может ли позволить себе такие вольности Александр Лукашенко. С одной стороны, может, так как он президент независимой страны, а не российского региона. С другой — не может, так как после последних президентских выборов слишком зависим от России.

На момент сдачи этого номера в печать никаких подробностей переговоров Михаила Мясниковича в Баку известно не было. Сообщалось только, что визит проходит по приглашению азербайджанской стороны и что белорусского премьера будут принимать на самом высоком уровне — и президент Ильхам Алиев, и глава правительства Азербайджана Артур Раси-заде.

**Игорь МОРОЗОВ.**

# Больш за трох не збірацца

*Чарговая маўклівая акцыя "Рэвалюцыя праз сацыяльныя сеткі" адбывалася ва ўсіх раёнах сталіцы і рэгіёнах. Колькасць затрыманых цягам трох апошніх акцый у два разы перавысіла колькасць затрыманых падчас разгону акцыі пратэсту 19 снежня. Спіс наблізіўся да лічбы паўтары тысячы.*

## Паляванне. На каго?

*6 ліпеня ў міліцэйскія пастарункі трапілі 26 журналістаў. Адных кінулі ў міліцэйскія аўтазакі, другім не давалі працаваць.*

Каля Палаца спорту да натоўпу карэспандэнтаў яшчэ за гадзіну да пачатку акцыі наблізіліся невядомыя асобы, якія адразу сказалі: "Здымаць мы вам усё роўна не дадзім. Увогуле, не стварайце натоўп, а сыходзьце адсюль. Мы вас пакуль па-добраму просім".

Але пакуль нас "прасілі па-добраму", дзецюкі ў цывільным пабудавалі ланцуг і пацiху штурхалі карэспандэнтаў далей ад месца правядзення акцыі. "Чаму нам нельга тут знаходзіцца? Патлумачце". Мужчына ў цывільным, які, відаць, быў галоўным, сказаў: "Тут будуць зараз адбывацца вучэнні". "Якія яшчэ вучэнні?!" — просім тлумачэнняў. "А вось гэта сакрэтная інфармацыя", — пачулі ў адказ.

Як толькі хто-небудзь з карэспандэнтаў пачынаў здымаць, камеру закрывалі альбо спінай, альбо рукамі. Усе спасылкі на Закон аб СМІ і просьбы не перашкаджаць працаваць ніякага плёну не далі. Пагрозы, што будзе разбіта камера, успрымаліся абсалютна ўсур'ёз, бо апошнім часам з боку сілавікоў гэта стала нармальнай практыкай. Усе перараканаліся: калі камеру не паб'юць, не вырвуць з рук, то могуць пырснуць газам у твар...

Колькасць збітых журналістаў расце з кожнай новай акцыяй. Дагэтуль у маскоўскім шпіталі з чэрапна-мазгавой траўмай знаходзіцца карэспандэнт брытанскай медыякарпарацыі ВВС Максім Ламакін. 29 чэрвеня яго збілі з ног у цэнтры горада і пацягнулі ў аўтобус. Калі Максім пачаў крычаць: "Я журналіст "Бі-Бі-Сі"! Не біце!" яго кінулі на асфальт і яшчэ некалькі разоў ударылі нагамі.

У той жа вечар Максім Ламакін перадаў кадры мінскіх падзей у Маскву, а таксама паспеў распавесці ў жывым эфіры "Бі-Бі-Сі", як беларуская міліцыя абыходзіцца з прадстаўнікамі прэсы. Начным цягніком Ламакін даехаў да Масквы, і там яго шпіталізавалі.

22 чэрвеня было затрымана 6 журналістаў, і гэта ўспрымалася як сенсацыя. Але з кожнай маўклівай акцыяй колькасць затрыманых журналістаў павялічвалася ў геаметрычнай прагрэсіі. 6 ліпеня з 26 затрыманых карэспандэнтаў сямёра засталіся за кратамі. Гэта Сяргей Кавалёў (Мінск), Алесь Асіпцоў (Магілёў), Віктар Масаловіч (Бабруйск), Віктар Качан (Бабруйск), Сяргей Лацінскі (Бабруйск), Аляксандр Сушчэўскі (Бабруйск) і Вольга Рудніцкая (Маладзечна).

Журналістка газеты "Салідарнасць" Алена Якжык трапіла ў міліцэйскі аўтобус на вачах прэс-афіцэра МУС, які, паводле сваіх службовых паўнамоцтваў, абавязаны дапамагаць журналістам падчас асвятлення масавых мерапрыемстваў.

**Любоў ЛУНЁВА.**

## «Хачу спытаць таго байца, які мяне душыў: сынок, за што?»



Пенсіянер Уладзімір Марозаў, якому зрабілася кепска падчас затрымання ўдзельнікаў маўклівай акцыі пратэсту 6 ліпеня ў Мінску каля Нацыянальнай бібліятэкі, раніцай у чацвер прыйшоў на месца інцыдэнту, каб расказаць, як усё адбывалася.

Паводле слоў пенсіянера, ён проста сядзеў на лаўцы разам з іншымі пажылымі людзьмі. "Я не тупаў, не крычаў, не міргаў, я проста сядзеў", — расказаў Уладзімір Марозаў БелаПАН.

Тым не менш да пенсіянераў падышлі двое ў цывільным і папрасілі сысці. У сваю чаргу Уладзімір Марозаў папрасіў іх прадставіцца. "На гэтым размова скончылася і пастуціла каманда хапаць і цягнуць мяне ў аўтобус", — сказаў пенсіянер.

Уладзімір спрабаваў папярэдзіць тых, хто нападаў, што ён інвалід і ў яго хворае сэрца. Але мужчыны працягвалі цягнуць пенсіянера ў аўтобус.

— Яны дзейнічалі як сапраўдныя бандыты, — не вытрымаў Уладзімір Марозаў. Паводле яго слоў, у нейкі момант ён страціў прытомнасць, але "бандыты ў пагонах" не дазволілі навакольным нават выклікаць "хуткую дапамогу". Калі ён ачуняў, побач былі мінакі, якія дапамаглі яму дайсці да прыпынку і пасадзілі ў таксі.

Мужчына паведаміў, што не пакутуе на падучую хваробу, але ў яго хворыя сэрца і лёгкія. Таму, калі на яго навaліліся людзі ў цывільным, ён пачаў задыхацца.

— Але я ж не тэрарыст, я не забойца, я пенсіянер, — сказаў Марозаў. — За што вось так мяне? Хачу спытаць таго байца, які мяне душыў: сынок, за што ты мяне душыў?

ФЕСТИВАЛЬ

## *Сегодня в Витебске — торжественное открытие XX Международного фестиваля искусств «Славянский базар»*

Традиционно открытие "Базара" посещает А.Лукашенко, что, как подметили российские журналисты, *"автоматически делает этот концерт самым крупным светским событием в жизни провинциального Витебска".*

На конкурсе молодых исполнителей Беларусь представит **Алена Ланская**. Кстати, обладатель Гран-при конкурса молодых исполнителей эстрадной песни "Витебск-2011" в этом году получит не 10, а 15 тысяч долларов. За первую премию конкурса заплатят 9 тысяч долларов, за вторую — 6, за третью — 3 тысячи.

Завершится фестиваль 14 июля большим звездным концертом.

**БУДЬ В КУРСЕ**

### Правила поведения на «Славянском базаре»

*Нельзя пить, фотографировать, иметь оружие и любые напитки в стеклянной посуде.*

"При входе в Летний амфитеатр — контроль билетов и проверка на безопасность, — сообщает дирекция фестиваля. — На концерты без билета пропускаются дети в возрасте до 5 лет.

Центр культуры "Витебск" оставляет за собой право отказать зрителям в допуске и/или присутствии в зале Летнего амфитеатра при нарушении правил посещения культурно-массовых мероприятий. На концертах запрещается находиться в состоянии алкогольного, наркотического опьянения. Во избежание несчастных случаев запрещается проносить на концерты взрывоопасные, легковоспламеняющиеся вещества, газовое и огнестрельное оружие, острые предметы, любые напитки в стеклянной посуде.

Фото- и видеосъемка запрещена".

**Марина ВИШНЕВСКАЯ.**

**ЗА КРАТАМІ**

## Дзмітрый Ус на абследаванні

*Жонцы экс-кандадыта ў прэзідэнты не дазволілі сустрэцца з мужам.*

— Пісала заяву аб спатканні, мне адмовілі і сказалі, што да касацыі ніякіх спатканняў даваць не будуць, — сказала Яўгенія Ус.

Касацыйную скаргу Уса разам са скаргамі экс-кандыдата ў прэзідэнты Мікалая Статкевіча і асуджанага Аляксандра Класкоўскага павінны разглядаць 19 ліпеня ў Мінскім гарадскім судзе.

Зараз Ус знаходзіцца ў мінскім СІЗА, ён праходзіць абследаванне на прадмет пацвярджэння інваліднасці. Як вядома, некалькі гадоў таму Дзмітрый Ус перанёс цяжкую аперацыю, ляжаў шмат дзён у коме, пасля гэтага яму была прызначана 2-я група інваліднасці. Але напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў ён не стаў пацвярджаць інваліднасць.

Сустрэцца з Дзмітрыем Усам дазволілі яго адвакату Аляксандру Галіеву. Па словах абаронцы, настрой у Дзмітрыя нармальны. І схуднеў ён не на 26 кг, як паведамлялася раней, а на 8 кілаграмаў.

11 ліпеня Уса павінны адправіць назад у магілёўскую калонію, дзе ён адбывае пакаранне.

## Андрэя Саннікава наведаў адвакат

Яшчэ адзін экс-кандыдат у прэзідэнты — Андрэй Саннікаў — дагэтуль знаходзіцца на "Валадарцы". У сераду яго наведаў адвакат. Праз абаронцу Саннікаў перадаў спіс лекаў, набыць якія папрасіў родных.

Жонка Саннікава Ірына Халіп кажа, што днямі Андрэй Саннікаў напісаў заяву на імя Генпракурора адносна таго, што з ліпеня мінулага года яго тэлефоны незаконна праслухоўваліся. "Як вядома, гэта вельмі грубае парушэнне закона і канстытуцыйных правоў грамадзяніна, і Андрэй патрабуе разабрацца, расследаваць і ў рэшце рэшт зрабіць хоць нешта".

**Ігар ЗАЛЕСКІ.**

**ЧУЛІ?**



## Жыроўкі «пацяжэюць» на 30 працэнтаў

Узровень кампенсацыі насельніцтвам затрат на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўжо ў гэтым годзе ўзрасце з 22 працэнтаў да 30. Такую заяву зрабіў віцэ-прэм'ер Сяргей Румас.

*"Мы вымушаны павышаць тарыфы на камунальныя паслугі,* — цытуе Сяргея Румаса БЕЛТА. — *У нас ёсць строгае абавязацельства па выхадзе на 30-працэнтную кампенсацыю затрат насельніцтвам у тарыфах".* Паводле слоў віцэ-прэм'ера, павышэнне будзе адбывацца не ў момант, а пастунова да канца года. А малазабяспечаным слаям насельніцтва ўрад абяцае вярнуць субсідыі.

## Бензін падаражэе нязначна?

Сяргей Румас таксама паведаміў, што да канца года магчыма павышэнне цэн на бензін. У прыватнасці, нязначна павысіцца цана на 95-ы бензін. *"Потым, магчыма, будуць павышацца цэны на іншыя віды паліва, але гэта ўсё будзе адбывацца пад кантролем урада і не перавысіць параметры, якія вызначыў прэзідэнт",* — перадае заяву Румаса БЕЛТА.

Вядома, што паліва ў Беларусі пераведзена ў разрад сацыяльна значных тавараў і кошт на яго можа павялічвацца на 3—5 працэнтаў раз у квартал. Дарэчы, у трэцім квартале павышэння пакуль не было.

# Подожди, внучек...

*Грустная исповедь о том, как автор из-за некомпетентной, непродуманной, сумбурной финансово-экономической политики власти попал в разряд «лохов» и вместе со всей своей семьей сел на мель*

Долго терзался мыслью: писать или не писать в газету о том, как судьба-злодейка ударила меня исподтишка, можно сказать, прямо в солнечное сплетение. А дуплетом — в и без того нездоровое сердце, где остались два рубца после двух инфарктов...

Поводом для таких вот мучительных нравственных терзаний послужило то, что я постыдно и нелепо просчитался, купившись и понадеявшись на бесконечные успокоительные заверения и посулы власти своему народу. Сколько раз мы слышали: "сильная и процветающая Беларусь" идет верным курсом, рубль наш национальный стоит упруго и твердо, невзирая на все жалкие вопли и злорадство "свядомай" оппозиции и ее западных спонсоров. А ежели, дескать, что такое форс-мажорное случится в республике, так у нас с Прокоповичем есть немеренные золотовалютные резервы!

Эти слова да Богу в уши. Но, видать, бог их не услышал. А потому я и попал в разряд "лохов" и вместе со своей семьей сел на мель.

Но ближе к делу. Принять правильное решение о своем публичном (через газету) "саморазоблачении" в науку другим наивным и легковерным гражданам Синеокой меня заставил мой младший внук восьмиклассник Сашка. Некоторое время назад он, улучив момент для разговора со мной по душам, спросил:

— Дед, а что ты планируешь подарить мне ко дню рождения?

Ну и хитрец! До дня рождения еще ого-го сколько ждать, а он уже печется о дедовых подношениях к своему 14-летию. Но гвардия не отступает, как я говорю по своей давней офицерской привычке. И тут же, несмотря на то что был застигнут врасплох неожиданным вопросом наследника и зная, что прошлогодние сандалии (купленные мною) он, как прирожденный "моторный" непоседа, порядком поизносил, тут же предложил ему свой вариант, подыгрывая его лексикону:

— Поедем вместе на "Ждановичи" и выберем тебе прикольные кроссовки...

— Ну, это мама мне уже пообещала... — он пренебрежительно скривил губы. — А слабо тебе подарить мне классный гоночный велик? У многих пацанов из моего класса давно уже есть такие...

Розовые мечтания отпрыска мне показались чрезмерно завышенными. Однако я, как любящий и отнюдь не скупой дед, решил по такому случаю не зажиматься на расходы. Предложил Сашке обзвонить все спортивные торговые точки Минска, а также своих друзей и узнать, сколько же тянет в деньгах та штуковина, что не дает ему покоя. Вскоре он мне по-военному четко и лаконично доложил: "Самый скромный вариант — порядка двух миллионов". Сохраняя внешнее спокойствие, я удивленно крякнул про себя и опять же мысленно произвел нужные экспресс-расчеты, исходя из небогатого семейного бюджета (который, кстати говоря, после грабительской девальвации усох наполовину). Так, ежели брать только минимум — требуемые внуком два миллиона нашенских "зайцев", то это значительно больше, чем вся моя офицерско-ветеранская пенсия. А пенсия жены покроет лишь четверть контрольной суммы. Она же, половинка моя, будучи весьма экономной, рачительной хозяйкой, громко и темпераментно запротестовала против столь дорогого презента внуку. "За какую-то железку — два миллиона отдавать?! Да знаете ли вы, господа иждивенцы мои, сколько стоят сейчас лекарства, гречка, сахар, масло, свекла, клубника?! Это же безумие — столь легкомысленно тратиться сейчас на разные цацки! Да еще Сашок наш — это же Шумахер в миниатюре. Сколько мы разных велосипедов покупали ему после того, как он научился на них ездить? Штуки четыре или пять? И все он разбивал в щепки за несколько недель! Хорошо, что сам при этом не покалечился... А на гоночном или сам разобьется, или влипнет в какую-нибудь аварию... Лучше мы с дедушкой купим ему путевку в детский летний лагерь".



Тут надо сказать о том, что в результате одномоментной и такой разорительной для народа девальвации, о которой наша демоппозиция чуть ли не благим матом предупреждала почивающую на лаврах власть, фактически беспричинно и нелогично упали в цене не только наши зарплаты и пенсии. Разорительно подешевели, обесценились враз и наши скромные стариковско-пенсионерские сбережения. Которые большинство пожилых граждан — кто явно, а кто тайно, подсознательно веря радимому государству и лично известно КОМУ, — хранило не где-нибудь в крутом коммерческом банке, а именно в нашем достославном "Беларусбанке". И именно в родимой национальной валюте. Держал там срочный банковский вклад в виде десяти миллионов нашенских "зайцев" и я. Веря в то, что, как утверждали многие наши "рулевые", вот-вот настанет время, когда и наша нацвалюта станет конвертируемой и за нашими национальными банкнотами страждущие граждане будут стоять в очередях у обменников...

И когда вопрос о покупке "классного гоночного велика" был отложен не неопределенное время, хлопец, опять же улучив момент для разговора со мной по душам, снова вернулся к больной теме:

— Дед, так неужели ты не можешь купить мне велик? У тебя же на книжке аж десять миллионов...

Несмотря на то, что столь необычайная осведомленность внука о состоянии и величине семейных денежных запасов опять повергла меня в легкое замешательство, я все же сумел сохранить кажущееся свое хладнокровие и почтительную сдержанность "аксакала", продолжив с отпрыском столь щепетильный разговор на равных.

— У нас в Беларуси произошла чувствительная для национальной валюты девальвация, — профессорско-преподавательским тоном начал я, посвящая внука в элементарные финансово-экономические расчеты. — В результате чего наш белорусский рубль подешевел по сравнению с долларом, считай, на две трети. Значит, и мои десять миллионов, можно сказать, усохли, то есть уменьшились до шести с хвостиком...

Сашка вскочил из-за стола и, подпрыгнув ко мне, остановился, как вкопанный, приняв боевую стойку гневного обличителя:

— Зачем же ты хранил деньги в рублях, а не в долларах или евро, как все нормальные люди?! Какой же ты лох, дед...

Другой на моем месте дал бы внуку за такую кликуху увесистую оплеуху или затрещину. Однако я, прошедший за время офицерской службы в советских Вооруженных силах "школу мужества и морально-психологической выдержки", сдержался, молча проглотив столь горькую пилюлю. Ибо внук оказался абсолютно прав, хоть и выразился непозволительно дерзко.

В то время, когда умные, прозорливые, в меру хитрые и изворотливые люди снимали свои вклады в национальной валюте и меняли или же переводили их на вклады в валюте, я вынужден был по семейным обстоятельствам пребывать в Украине. Знал бы, в какую яму завели Беларусь наши "сусанины", накупил бы там вдоволь баксов. Но, образно говоря, прошляпил я. И теперь приходится лить слезы.

Недавний случай. Безрезультатно пыталась моя жена приобрести в обменниках хотя бы сотню долларов на поездку к девятому мая в Вильнюс, к нашим друзьям молодости, пригласившим нас на золотой юбилей своего бракосочетания. Из-за этого так и не смогли вживую поздравить их на День Победы с их замечательной датой! В то время как население соседних стран, в том числе и некогда осмеянных официальными СМИ Литвы или же Украины (за то, что "там невозможно жить!"), теперь существует вполне пристойно, нам, в Беларуси, приходится во многом себе отказывать из-за мизерных зарплат, пенсий, отсутствия валюты в свободной продаже.

Впрочем, была бы у меня валюта, но сам себя перехитрил. Вернее, меня перехитрил тот же "Беларусбанк". В одно время он развернул такую массированную рекламу о "высокопроцентных срочных вкладах", что я, поддавшись ее магии, перевел доллары в белорусские рубли. Думал ли я, заключая договор с банком, что он начнет исподтишка изменять ранее объявленную высокую ставку рефинансирования именно и исключительно в сторону ее понижения.

Как весь этот "шахер-махер" выглядел на моем печальном примере? Когда я конвертировал доллары в рубли, процентная ставка была аж 23% годовых! Что тут было раздумывать? Вот она, удача! Вперед, мечте навстречу! Ведь "Беларусбанк", как я полагал, — солидная государственная "фирма", верный гарант моего вклада. А не какой-то заштатный приватный банк, способный враз "испустить дух", раствориться в неведомой туманности Андромеды из-за нескончаемых отечественных несуразиц и катаклизмов в политике и экономике. И тогда ищи ветра в поле, чтобы вернуть свои денежки! При наших порядках и законах такие намерения вряд ли осуществимы. Я с подобной ситуацией уже сталкивался. И получил дырку от бублика, когда в 1995 году позарился было на высокие — до умопомрачения — 505 (пятьсот пять) процентов годовых (!!!) за вклад в трастовую компанию "Техинпром".

Теперь же жизнь сложилась так, что после оформления договора на хранение вклада в "Беларусбанке" в сумме четырех миллионов белорусских рублей в феврале 2010 года, я пришел в банк лишь в октябре того же года с намерением снять проценты (жизнь заставила!). Которых, как я предполагал по своим округленным подсчетам, должно было накапать где-то около 700.000 наших "зайцев". Однако окошко сберкассы выдало мне на руки сумму, почти вполовину меньшую! "Но это явное недоразумение, ошибка! — гневно вскричал я в адрес девушки в окошке. — При двадцати трех процентах годовых — и такой мизер за полгода?! Пересчитайте!" Девушка сочувственно улыбнулась: "Успокойтесь, пожалуйста, мужчина. Вы разве не знаете, что с тех пор, как вами был оформлен договор, размер процентной ставки менялся несколько раз?" "И что, только в сторону уменьшения?!" — моя ярость благородная по-прежнему "вскипала, как волна". "Выходит, что так, — с прежней невозмутимостью ответила леди, с сочувственной снисходительностью глядя на рассвирепевшего седовласого, в приличных годах "лоха". — Подождите минуточку, я сделаю вам распечатку по месяцам всех изменений процентной ставки по вашему вкладу".

Получив на руки распечатку и вчитавшись в нее, я был взбешен.

Изменение размера процентной ставки:

с 25.02.2010 — 23.00% годовых,
с 25.05.2010 — 19.00% годовых,
с 17.06.2010 — 17.00% годовых,
с 14.07.2010 — 16.50% годовых,
с 18.08.2010 — 16.00% годовых,
с 02.09.2010 — 14.50% годовых,
с 15.09.2010 — 14.00% годовых.

Дата наступления срока возврата вклада — 25 февраля 2013 года.

После оформления договора с "Беларусбанком" от 25 февраля 2010 года на вклад под милым названием "Новый" за №111000726 с начальным размером процентной ставки в 23% годовых этот самый размер за прошедшие шесть месяцев лежания моих четырех миллионов в банке менялся шесть раз. И всегда — в сторону усушки рекламно заявленной весьма высокой ставки! С начальных 23% процентная ставка стабильно уменьшалась. То есть за те полгода срока, в течение которого родимое государство в лице своего "Беларусбанка" крутило мои денежки так, как ему заблагорассудится (причем, повторяю: я не имел права по "Договору" снимать деньги с вклада в течение трех месяцев, иначе "горел, как швед под Полтавой"), размер заявленной, то есть фактически "зазывной", "рекламной" процентной ставки по вкладу уменьшился на 35 процентов. Спрашивается, можно ли среднестатистическому гражданину РБ при такой "накопительной системе" в головном банке страны собрать деньжат, к примеру, на квартиру? Или на тот же велик внуку? И стоит ли удивляться, что столь явная нечистоплотность, двуличность этой госфирмы во взаимоотношениях с вкладчиками, среди которых люди в основном самого скромного материального достатка и жизненного комфорта, не мешает начальнику этого учреждения госпоже Н.А.Ермаковой стабильно находиться в фаворе у власти, получать высокие правительственные награды?

И сегодня я, как неудачник-погорелец, задаюсь вопросом: а собирается ли государство и, в частности, его такое важное стратегическое подразделение, как "Беларусбанк", в определенной мере компенсировать мой убыток (и подобных мне наивных и доверчивых граждан-вкладчиков). Ведь будь мы осмотрительнее и хитрее — ходили бы сегодня не с валидолом или нитроглицерином в карманах, а эдакими петухами-задаваками (заправленными коньячком), которым и море по колено! Почему бы государству, уже имея на руках первый транш обещанного кредита от ЕврАзЭС, не выручить нас, погорельцев, — за веру в "родны кут", в Отчизну, какой бы она ни была, в какие бы передряги и катаклизмы ни попадала? Разве те жалкие два процента повышения ставки рефинансирования, о которых на днях объявил Нацбан, могут заметно и существенно компенсировать, покрыть их потери и убытки?! И где звучный голос, внятная принципиальная позиция по этому действительно больному вопросу наших хваленых козиковских профсоюзов, лидеры и функционеры которых годами молча сидят, как серые мышки под веником? А почему так же самозабвенно и стабильно безмолвствуют народные депутаты обеих палат Нацсобрания? Не пора ли им всем громогласно и внятно заявить о том, например, что сегодня срочно нужен специальный Указ президента Республики Беларусь по данной общегосударственной проблеме, который бы не только восстановил социальную справедливость, но и повысил явно пошатнувшийся в последнее время авторитет государственной власти. В этом документе можно было бы, на мой взгляд, заложить возможность выдачи пострадавшим вкладчикам соответствующей доли акций приватизированных госпредприятий взамен залежавшихся и ненужных фантиков — именных приватизационных чеков "Имущество". А кто или что мешает власти, государству выпустить, к примеру, государственные долговые обязательства на право получения льготных кредитов под строительство или покупку жилья для пострадавших от девальвации и инфляции, конца и края которой пока что не видно? Да выделить для них, бедолаг, по приемлемым ценам производимую в республике сложную бытовую технику. Да запрограммировать для них выдачу земельных участков — опять же по щадящим ценам...

Могут быть и другие предложения. Но меня настораживает позиция властей. Они об этом говорить не хотят, тупо повторяя одну и ту же фразу: "От нашей белорусской модели мы не отступимся!" Но спрашивается: а нужен ли нам сегодня такой хоккей?! Ведь, по существу, эта модель сварганена неумело. Коряво и наспех. Потому похожа на ярмо, от которого у кастрированных быков, используемых на сельскохозяйственных работах, шеи кровоточат...

**Александр ОЛЬХОВОЙ, житель Минска.**

## На будаўніцтва АЭС пазычым 6—7 мільярдаў долараў

*Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч расказаў журналістам, на якіх умовах Расія дае крэдыт на будаўніцтва атамнай станцыі ў Беларусі.*

*"Мы дамовіліся з Кудрыным, і гэта пытанне абмяркоўвалася з Пуціным, аб прынцыпах крэдытавання самой станцыі, не толькі ядзернага вострава, а ў цэлым аб'екта, уключаючы інжынерную інфраструктуру, неабходную для работы станцыі",* — цытуе Мясніковіча БЕЛТА. Адказваючы на пытанне аб памеры расійскага крэдыту на будаўніцтва беларускай АЭС, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што гэта будзе не менш як 6—7 млрд долараў. *"85 працэнтаў у нас ідзе па адпрацаванай схеме крэдытавання, з улікам таго, што мы не будзем прэтэндаваць на пазыкі пад сацыяльную інфраструктуру,* — сказаў ён. — *Мы дамовіліся, што крэдыт будзе прадастаўляцца і пад астатнія 15 працэнтаў за мінусам тых работ, якія ўжо выкананы беларускім бокам. Дакладны аб'ём крэдыту пакажа эспертыза".*

## Назапасілі...

*У першым паўгоддзі 2011 года на тэрыторыю Беларусі ўвезена рэкордная колькасць легкавых аўтамабіляў — больш за 250 тысяч.*

Лічбу агучыў намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта Беларусі Сяргей Полудзень. *"Гэта своеасаблівы рэкорд не толькі паўгоддзя, але і года. Увозу такой колькасці аўтамабіляў у нас яшчэ не было",* — сказаў Сяргей Полудзень.

У ранейшыя гады на тэрыторыю Беларусі ўвозілася прыкладна 180—200 тысяч аўтамабіляў за год. Зараз пра гэта можна забыцца. З 1 ліпеня з-за велізарнай мытнай пошліны патрыманыя іншамаркі для беларусаў будуць проста недасягальныя.

Трэба адзначыць, што памер мытных пошлін за 1 паўгоддзе 2011 года склаў больш за 300 мільёнаў долараў.

**ДАРЭЧЫ**

## Без даплат у Расію

*"Аўтамабілі, увезеныя і афармленыя ў Беларусі да 1 студзеня 2010 года, могуць беспераашкодна перамяшчацца ў Расійскую Федэрацыю. Па іх ніякіх даплат да мытных пошлін не патрабуецца",* — заявіў на прэс-канферэнцыі Сяргей Полудзень. Іншыя нормы дзейнічаюць адносна аўтамабіляў, увезеных на тэрыторыю Беларусі з 1 студзеня 2010 года па 30 чэрвеня 2011 года. *"Па гэтай катэгорыі аўтамабіляў цяпер, калі яны будуць увозіцца ў Расію, належыць даплата да мытнай пошліны",* — сказаў Сяргей Полудзень. Даплату можна рабіць як у Беларусі, так і ў Расіі.

**ВОПРОС—ОТВЕТ**

## Помощь в размере около 915 млн рублей

***Читала в "Народной Воле" о том, что не всем пострадавшим во время теракта в метро выплатили материальную компенсацию. Любопытно, а сколько человек получили помощь от государства?***

**А.Гончарова, Минск.**

По сведениям на последние дни материальная помощь выплачена 321 пострадавшему и члену семей погибших (умерших) на общую сумму 914 млн 900 тыс. рублей.

Такую статистику привела заместитель начальника управления социальной поддержки населения комитета по труду, занятости и соцзащите Мингорисполкома Ирина Дудка агентству "Минск-Новости". Отказано в оказании материальной помощи 41 гражданину. Отказано потому, что у них не зафиксированы телесные повреждения.

Также Ирина Дудка отметила, что материальное возмещение пострадавшим по обязательному страхованию гражданской ответственности перевозчика перед пассажирами производит страховая компания "Белэксимгарант". 250 пострадавших и члены семей погибших получили выплаты на общую сумму более 1 млрд 907 млн рублей. К слову, по данным комитета по здравоохранению Мингорисполкома, количество пострадавших от взрыва в метро — 448 человек. Из них 15 погибли (умерли), 222 были госпитализированы, 169 обратились в поликлиники.

**ПАД ГРАДУСАМ**

## Нарэшце пацяплее

Цыклон, які так доўга псаваў надвор'е ў Беларусі, губляе сваю актыўнасць і ідзе на суседнія вобласці Расіі, паведаміла карэспандэнту БЕЛТА начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра **Людміла ПАРАШЧУК.**

У суботу на Беларусь пачне паступаць паветраная маса з поўдня Еўропы — яна будзе значна цяплейшая, але па-ранейшаму вільготная. Таму ўначы па паўднёвым захадзе, а ўдзень месцамі па рэспубліцы чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература паветра складзе плюс 12—19 градусаў. Удзень будзе 23—28 градусаў вышэй за нуль. У асобных раёнах слупкі тэрмометра дасягнуць 30-градуснай адзнакі.

10 ліпеня чакаецца камфортнае надвор'е. Дажджоў будзе мала, толькі ў асобных раёнах пройдуць кароткія навальнічныя дажджы. Уначы будзе плюс 13—19 градусаў, удзень — ад 25 градусаў цяпла на поўначы да 31 градуса вышэй за нуль на поўдні краіны.

У першы дзень наступнага тыдня тэмпература паветра ўначы складзе 12—19 градусаў цяпла, удзень — 26—32 градусы.

У наступныя дні ў многіх раёнах захаваецца вельмі цёплае надвор'е, толькі ў паўночна-заходніх раёнах, дзе будзе ўплываць франтальны раздзел з Заходняй Еўропы, у дзённы час спёка крыху спадзе.

У сераду, 13 ліпеня, максімальная тэмпература ўдзень чакаецца ад 23 градусаў цяпла на паўночным захадзе да 32 градусаў на паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці.

СУСТРЭЧЫ

# Іванаў «Эрмітаж»...

*Былы ляснічы арганізаваў на Іўеўшчыне прыватны музей. Падзівіцца на рэдкія экспанаты выправіўся карэспандэнт "Народнай Волі".*

Ну хто не ведае на Іўеўшчыне Івана Буйко?! А скуль такая вядомасць? Па-першае, Іван Мечыслававіч сапраўдны лясны чалавек, дармо што мае прыгожы дамок у горадзе: лічы, трыццаць гадоў (з гакам) адслугаваў лесу. Доўгі час быў галоўным ляснічым раёна і спраўна, талкова вёў гаспадарку. А зараз слугуе будучыні свайго краю, бо цяперашні Іванаў клопат — лясны гадавальнік.

З тысяч дрэўцаў, якія выпешчваюцца на дзялянках, падымуцца некалі цэлыя гаі і дубровы — на радасць усім. То як не ведаць пра такога чалавека?!.. Але павагу людзей (не адно тутэйшых, усяе Гарадзеншчыны) заслужыў Іван яшчэ з аднае прычыны — ён утрапёны аматар-краязнаўца, збіральнік матэрыяльнай, культурнай і гістарычнай спадчыны роднага краю. Займаецца гэтым, лічы, з маленства — ледзь не сорак гадоў... Не дзіва, што другі паверх дамка ператварыўся ў сапраўдны краязнаўчы музей — адзіны прыватны на Іўеўшчыне; не дзіва, што сюды наведваюцца людзі з розных куткоў Беларусі, з-за мяжы. Ёсць на што паглядзець, патрымаць у руках, прачытаць, выведаць... Натуральна, прамінуць такое было немагчыма, і вось я выправіўся ў Іўе...



Гаспадар — моцна збіты, рухавы і гаваркі мужчына — адразу запрасіў на паддашак, значыцца, на другі паверх. Крутая, вузкая лесвіца — маснічкі ажно сцёртыя ад падэшваў — вывела ў невялічкі пакой, скрозь застаўлены экспанатамі самага differently рознага і нечаканага (былога, канечне) ужытку. Старадаўнія прасы, посуд, куфэркі, патэфоны, грамафоны, самавары, кайданы, сцягі — сотні ўсяго ўсялякага... Другі пакойчык таксама ўвесь — ад падлогі да столі — заняты экспанатамі. Што цікава, кожная рэч — як і прынята ў музеях — пранумеравана, падпісана, словам, мае свой пашпарт. "Цеснавата толькі, — бядуе Іван Мечыслававіч, — але як ёсць, тут у мяне пяць тэматычных раздзелаў, цяпер во пачаў сістэматызаваць фонды. Недзе трэць іх перакачавала ў бацькоўскую хату ў Бяжэмцах..."

**— Скуль такая прага да збіральніцтва прадметаў даўніны, Іван Мечыслававіч? Ведаю некаторых калекцыянераў, але ў іх строга выверaны абсяг інтарэсаў. Нехта абмяжоўвае сябе карцінамі, нехта стардрукамі, нехта нумізматыкай... А ў вас усё адразу — свайго роду краязнаўча-эклектычны набор...**

— Без эклектыкі ў краязнаўстве, лічу, цяжка абысціся... Тым больш калі ставіш на мэце ўзнавіць побыт, жыццё мінулых пакаленняў, сваіх продкаў. Тут жа не проста збіральніцтва, як такое, а вывучэнне, захаванне нашай побытавай культуры. Людзі часам не задумваюцца — адкуль яны, чаму ў іх такая гаворка, такія схільнасці, такі ўклад жыцця, такія традыцыі... А дарма, бо самаідэфікацыя робіць нас непаўторнымі, а значыцца, і вартымі павагі з боку іншых народаў і культур.

Памятаеце бессмяротныя словы Францыска Скарыны? *"Понеже от прирождения звери ходящие в пустыни знають ямы своя. Птицы летающие по воздуху ведають гнезда своя. Рыбы плывающие по морю и в реках чують виры своя. Пчелы и тым подобные боронять ульев своих. Такожъ и люди игде зродилися и ускормлены суть по бозе к тому месту великую ласку имають".*

Дык вось, і я маю ласку — люблю тое, што мне найдаражэй за ўсё: маіх бацькоў, маю Айчызну, свой радзімны куточак, сваіх дзяцей... Нас у сям'і было дванаццаць дзяцей. Матуля і бацька навучалі нас — не змушона, а натуральна — мове нашай, звычкам старэйшых пакаленняў, традыцыям ці то працоўным, ці то святочным. І ўсе дзеці павырасталі годнымі людзьмі, зараз перадаюць назапашанае, духоўнае сваім дзецям. І так павінна быць у кожным беларускім родзе, у кожнай сям'і. Тады мы будзем народамнацыяй, а не шукацьмем сякеру пад лаўкай... Калі нацыя, а не насельніцтва, то ніхто не віцьме з нас вяроўкі. Думаю, што вось так...



**— Іван Мечыслававіч, але ж вы адзіны ў сваім родзе, хто гэтак апантана збірае прадметы матэрыяльнай культуры, вывучае гісторыю краю...**

— А не зусім так, даражэнькі. Ёсць у мяне (дакладней, быў) настаўнік па краязнаўстве — мой дваюрадны дзед па прозвішчы Семак. Жыў ён у Каўнасе. У свой час скончыў Віленскі ўніверсітэт імя Стэфана Баторыя па спецыяльнасці "аграном". Людзі яго паважалі, і ўвогуле быў ён чалавекам неардынарным, дапытлівым даследчыкам-вучоным. Уласна, якраз дзед і прывіў мне цікавасць да радзіннага кутка, прапанаваў збіраць старыя рэчы і дакументы. А сам, як прыязджаў на сваю малую радзіму, выпраўляўся ў вандроўкі: запісваў песні, аповеды, мелодыі з усяго нашага наваколля. Словам, збіраў фальклор, расшукваў дакументы. І ўрэшце напісаў агромністы фаліянт (рукапіс) аб гісторыі роднай зямлі. Калі ён памёр, то мне давялося ратаваць тую агромністую пісаную кнігу, бо тамтэйшыя жыхары меліся выкінуць яе на сметнік. Для іх жа ўсё гэта — чужое... Дзедава кніга для мяне — падарожная ў нашу гісторыю, мой талісман і мой падручнік. І, зразумела, у музеі яна на пачэсным месцы. Дарэчы, многія студэнты, аспіранты скарысталіся ёю пры напісанні дыпломных і навуковых работ.

**— Апроч рэдкіх, унікальных прадметаў даўніны ў вас тут і велізарная бібліятэка... Мусіць, ёсць рэдкія экзэмпляры?**

Уласная бібліятэка налічвае звыш трох тысяч кніг. Ну і, канечне, вялікае мноства дакументаў, рукапісаў, падшывак старадаўніх часопісаў, газет... Наведвальнікі, бывае, так учытваюцца ў тэксты двухсотгадовых фаліянтаў, што не адарваць. Сядзелі б тут і дзень, і ноч... Вось, напрыклад, "Геаграфія", выдадзеная ў 1828 годзе. Для некаторых проста патрымаць у руках такую ксёнжку — завялікая радасць.

**— А вы дазваляеце трымаць у руках кнігі і экспанаты? Усё ж музей...**

— Мой тым і адрозніваецца ад усіх астатніх музеяў, што тут дазваляецца ўсё краtаць, прымяраць, чытаць, фатаграфаваць... Цяпер зірніце, а можаце і пагартаць, вось гэтую "Граматыку" 1818 года ці вось тоўсты фаліянт без вокладкі. Бачыце, тут у асноўным змешчаны царкоўныя тэксты, але, што цікава, на першых лістах, якія захаваліся, надрукавана азбука. Верагодней за ўсё, па ёй вучыліся чытаць манахі. Устаноўлена, што гэтай кнізе 300 гадоў. Ёсць у маёй кніжнай скарбніцы і сваё "Сотворение мира", выдадзенае ў 1700 годзе на стараславянскай мове. Гэтаксама "Энцыклапедыя раслін" у трох тамах, датаваная 1785 годам. Дадайце сюды вялікую колькасць дакументаў, якія пацвярджаюць ці абвяргаюць розныя гістарычныя падзеі. Найперш гэта паперы, якія расказваюць пра лёс закінутых маёнткаў, фальваркаў, іх гаспадароў, простых месцічаў. Асабліва шмат дакументаў, звестак пра касцёлы нашага краю. Гісторыю многіх я даследаваў. Прыкладам, касцёл у вёсцы Бакшты (помнік драўлянага дойлідства) згарэў падчас апошняй вайны. У ходзе росшукаў былі высветлены прычыны пажару, адначасова ўсплыло імя Ільдафона Бобіча. Гэтае імя нікому ні пра што не гаворыць. А вось пра Пятра Простага, думаю, некаторыя літаратуразнаўцы тое-сёе ведаюць. Дык вось, менавіта пад гэтым псеўданімам друкаваўся Ільдафон Бобіч, былы ксёндз-дыякан Іўеўскай дыяцэзіі...



**— Іван Мечыслававіч, ды ў вас тут — апроч усяго — і нумізматычная калекцыя не слабая, як пагляджу?..**

— Можа, і так. Маю такую схільнасць — калекцыяніраваць "зло" ўсіх часоў і народаў. Тут у мяне збор і папяровых грошай, і манет — з 60 краін свету. Ёсць "деньга" і "копейка" 1700—1701 гг., грошы Часовага ўрада Расійскай імперыі, урадаў Калчака, Дзянікіна, разліковыя білеты Балівіі, Замбіі, Чылі, процьма іншых, уключаючы сярэбраныя "лускі" Івана Грознага і каменныя дагістарычныя манеты.

Як і ва ўсіх музеях, у Іванавым маецца Кніга для наведвальнікаў, у якой удзячныя людзі пакідаюць свае запісы. Такіх вялікае мноства. Адзін добры чалавек, уражаны ўбачаным, пакінуў вершаванае:

*Энтузіяст ты не на жарты.*
*Аб тым, бадай што, кожны скажа.*
*А твой музей даўно ўжо варта*
*Назваць раённым Эрмітажам.*

На развітанне і я пакінуў не толькі "Народную Волю" за №1, але і свой сціплы, але ад сэрца струменячы ўхвальны запіс. Хай будзе — для гісторыі, якая пішацца тут і сёння. А подпіс пакінуў просты — "Народнаволевец"...

**Георгій ЧЫГІР.**
**Фота аўтара.**





## Размеркаванне можна купіць

*Савет Міністраў Беларусі зацвердзіў палажэнне аб парадку кампенсацыі ў рэспубліканскі і (або) мясцовыя бюджэты сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку маладых спецыялістаў.*

Адпаведна дакументу, зараз можна адмовіцца ад абавязковага размеркавання. Але толькі ў тым выпадку, калі выпускнік добраахвотна верне затрачаныя на яго навучанне сродкі. Для гэтага яму неабходна да заключэння працоўнага дагавора звярнуцца ва ўстанову адукацыі або дзяржаўную арганізацыю, якая рэалізуе адукацыйныя праграмы паслявузаўскай адукацыі, за разлікам сумы затрачаных сродкаў.

Напэўна, у краіне зусім няма грошай, калі чыноўнікі пайшлі на такі крок — зусім нядаўна яны пераконвалі ў неабходнасці абавязковага размеркавання. Маўляў, такая норма дапамагае вырашыць праблему кадраў, а выпускнікам — набірацца вопыту ў абранай прафесіі.

Але ж ці знойдуць грошы выпускнікі, якія хацелі б адмовіцца ад размеркавання? Вярнуць дзяржаве ім прыйдзецца немалыя сродкі, бо толькі за 2010—2011 навучальны год студэнтамплатнікам сталічных ВНУ прыйшлося заплаціць за адукацыю ў сярэднім каля 5 мільёнаў рублёў.

**Ігар ЗАЛЕСКІ.**

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ...

## Ці можа быць самаабарона ад асоб у цывільным?

*Рух "За Свабоду" звярнуўся ў МУС Беларусі ў сувязі з тым, што "апошнім часам фіксуюцца шматлікія факты нападу невядомых грамадзян на мінакоў у розных гарадах краіны. Людзі ў цывільным, ужываючы грубую фізічную сілу, хапаюць мірных грамадзян і, у некаторых выпадках збіваючы іх, зацягваюць у аўтамабілі, аўтобусы (часцяком без нумароў) або транспартныя машыны спецназа. Пасля гэтага іх дастаўляюць у аддзяленні міліцыі, дзе паведамляюць пра тое, што яны з'яўляюцца затрыманымі ў рамках адміністрацыйнага працэсу".*

Улічваючы сітуацыю, намеснік старшыні руху Юрась Губарэвіч звярнуўся ў МУС Беларусі з наступнымі пытаннямі:

1.Якія законныя сродкі самаабароны могуць быць ужытыя мірнымі грамадзянамі ў дачыненні да невядомых асоб, якія нападаюць на іх?

2.Якія законныя сродкі самаабароны могуць быць ужытыя мірнымі грамадзянамі ў выпадку, калі нападнікі з'яўляюцца пераапранутымі ў грамадзянскую вопратку супрацоўнікамі падраздзяленняў МУС, але пры затрыманні мірных грамадзян не выконваюць прадугледжаную законам працэдуру затрымання, часам ужываючы пры гэтым фізічную сілу і спецыяльныя сродкі?

3.У выпадку, калі затрыманне мірных грамадзян ажыццяўляюць супрацоўнікі падраздзяленняў МУС, але пры гэтым незаконна прымяняюць фізічную сілу і спецыяльныя сродкі, не выконваюць прадугледжаную законам працэдуру затрымання, якія законныя сродкі самаабароны могуць быць ужытыя мірнымі грамадзянамі ў адказ на заведама незаконныя дзеянні супрацоўнікаў МУС?

Цікава, які адказ атрымае спадар Губарэвіч.

Калі ён з'явіцца, пастараемся азнаёміць з ім чытачоў "Народнай Волі".

## 15 июля начнут работать школьные базары

Швейные и трикотажные фабрики концерна "Беллегпром" к школьному сезону поставят в белорусские магазины 715 тысяч единиц школьной одежды и 376 тысяч изделий школьного трикотажа. Об этом БелаПАН сообщили в пресс-службе концерна.

Этот объем согласован с Министерством торговли и предусматривает поставки в магазины по следующей схеме: 20% одежды для школьников — в июне, 50% — в июле, 30% — в августе. До 20 августа поставки в торговую сеть завершатся. Школьные базары в стране начнут действовать 15 июля.

РЕГИСТРАТУРА

## Белорусы будут болеть без больничного?

*По итогам своей работы в Беларуси эксперты ВОЗ в своих рекомендациях, как снизить нагрузки на врачей и тем самым победить очереди в поликлиниках, указывали и на опыт зарубежных стран, где не всегда в случае болезни требуется больничный лист. В европейских странах работник, который простудился или почувствовал недомогание, имеет право три-пять дней лечиться дома без больничного листа. Будет ли эта модель принята у нас?*

Статистика свидетельствует: в 40 процентах случаев белорусы обращаются в поликлиники, чтобы получить больничный лист, а не для того, чтобы уточнить диагноз или определить курс лечения. На Западе эту проблему решили таким образом — разрешили работникам в случае простуды или недомогания три, а в некоторых странах и пять дней, лечиться без больничного листа.

*— В разных странах от 3—5 дней болезни человек имеет право не брать больничный,* — поясняет представитель странового Бюро ВОЗ в Беларуси **Валентин Русович**. *— В этом случае он должен позвонить работодателю или, как в странах Балтии, еще и участковому врачу сообщить по телефону о своем недомогании. Первую неделю болезни в этих странах оплачивает работодатель из фонда заработной платы. И только на 7—10 дней, если болезнь не ушла, работник обращается к врачу, выписывается бюллетень, который уже оплачивается фондом общественного страхования. Западная модель подразумевает то, что работодатель лучше знает работника, чем его участковый врач. Кроме того, законодательно утверждено количество таких случаев, когда допускается болеть дома без больничного. И предприятие при этом не несет убытки, потому что освобождается от уплаты налогов на это количество дней. Для поликлиники такая модель — огромный плюс, потому что исчезает поток людей, атмосфера в поликлиниках меняется. Ни для кого не секрет, что сегодня очень часто белорусы жалуются, что им несправедливо не выписали бюллетень, а врачи, работу которых тщательно проверяют, утверждают, что при таком недомогании больничный они не имеют право выписывать.*

Эксперты ВОЗ рекомендовали такую форму выписки больничных листов белорусской системе здравоохранения. И, судя по всему, данная модель может быть принята. Во всяком случае на одной из коллегий Министерства здравоохранения заместитель премьер-министра Анатолий Тозик уже высказал мнение: *"Почему не принять решение о том, что в случае, если у человека насморк, руководитель может разрешить пару дней такому человеку побыть дома?"*

Хотя понятно, что от Министерства здравоохранения в данной ситуации мало что зависит. Решение должно приниматься на уровне правительства. Сегодня больничные листы работникам оплачиваются из средств Фонда социальной защиты. А если белорусам разрешат болеть дома без больничного, тогда эти дни им должен будет оплачивать работодатель из собственных средств. То есть изменится система финансирования.

**Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.**

## 2,7 миллиона евро

*Инвестировала компания Japan Tabacco International (JTI) в открытие новой производственной линии на Гродненской табачной фабрике "Неман".*

Об этом сообщил журналистам региональный директор JTI Мартин Брэддок. *"Мы запустили на фабрике новую линию для производства сигарет формата "супер слим". Это партнерский инвестиционный проект с ГТФ,* — отметил Брэддок. — *Очень важно, что компания JTI продолжает в этот сложный период инвестировать средства в Беларуси. Мы будем продолжать инвестировать средства в наши марки, в наше производство, в наших людей, в будущее, несмотря на все сложности с доступом к валюте, стабильностью обменного курса, прогнозируемостью акцизной политики",* — отметил региональный директор JTI, передает БелаПАН.

## У аб'езд!

*Па 15 жніўня ў пункце пропуску "Каменны Лог — Мядзінінкай" на беларуска-літоўскай мяжы з абодвух бакоў будуць праводзіцца планавыя работы па рэканструкцыі і абнаўленні тэрыторыі пункта пропуску.*

Як паведамілі ў прэс-цэнтры памежнага камітэта, для ажыццяўлення работ па замене дарожнага пакрыцця часова абмяжоўваецца лік палос для руху.

З 7.00 16 жніўня да 7.00 23 жніўня запланаваны завяршальныя работы па ўкладцы аўтадарожнага пакрыцця і яго маркіроўцы. На час правядзення гэтых работ пункт пропуску ўвогуле будзе закрыты.

У Дзяржпагранкамітэце Беларусі рэкамендуюць у гэты перыяд пры перасячэнні беларуска-літоўскай мяжы карыстацца пунктамі пропуску "Катлоўка—Лаварышкес" і "Беняконі—Шальчынінкай".

## Затрымалі групу, якая дапамагала «адкасіць» ад войска

На выкладчыка дапрызыўнай падрыхтоўкі адной са сталічных школ завялі крымінальную справу за падбухторванне да дачы хабару.

Ён падбухторваў мінчаніна да дачы хабару ў 4 тыс. долараў за спрыяльнае вырашэнне пытання аб прызнанні яго знаёмага непрыгодным да службы ва Узброеных сілах. Падбухторшчык быў затрыманы пры атрыманні грошай.

Падчас далейшых мерапрыемстваў пры атрыманні 1 тыс. долараў праваахоўныя органы затрымалі інспектара аддзела прызыву аднаго са сталічных ваенных камісарыятаў.

Затым пры атрыманні 700 долараў была затрымана доктарка, член міжраённай медыцынскай камісіі.

**Вячаслаў БУДКЕВІЧ, БелаПАН.**



Ніл ГІЛЕВІЧ

# Дзве страфы пра надзённа-вечнае

I.

Во хітруга!
Не б'е ў барабан.
Не пяе,
Не крычыць.
А стаіць і маўчыць. Як нямы!
Вось у нас і напруга.
Каб ён проста маўчаў —
Дык жа не!
Ён пра нешта маўчыць!
А пра што?
А пра што ён маўчыць?

Прызнавайся, хітруга!

II.

О народ беларускі!
Ты так красамоўна маўчыш,
Што маўчанне тваё
Ім страшней
За бунтоўныя крыкі.
Не, не доўга ўжо несці табе
Свой пакутніцкі крыж.
Ты — не раб.
Ты — вялікі.
Ва ўсім.
І ў маўчанні вялікі.

2011, чэрвень.

ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО

# Мы хотим быть услышанными

Здравствуйте, уважаемая редакция!

Я являюсь одной из тех многих граждан Республики Беларусь, которых наша власть называет "мычащей" толпой, отморозками, врагами народа, недорослями... Это мы вместе с остальной несознательной частью населения препятствуем власти вести грамотный политический и экономический курс, это мы устраиваем ажиотаж в магазинах, это мы в один момент скупили всю валюту, это мы "садим" себя в тюрьму, сознательно лишаем себя конституционных прав и свобод. Вот такие мы люди, за которых власти так стыдно. Ведь у нас все прекрасно, у нас нет высокого роста цен, нет безработицы, нет диктатуры, нет политических заключенных, наши права и законные интересы гарантируются и защищаются государством.

Мои ровесники выросли при нынешнем режиме, всю свою сознательную жизнь слышим одно и то же. Может, пора выйти с нами на диалог, услышать нас? Мы — будущее этой страны, и мы имеем право быть услышанными. Но ответ власти предсказуем: задержание, запугивание, устрашение, судебные процессы, тюрьма... Сколько можно использовать эти методы? Нужен нормальный, человеческий диалог.

Хватит "розгами бить" свой народ, хватит пытаться нас обвинить в своих ошибках, наступило время власти признать свои ошибки, услышать этих "молчаливых и непослушных" граждан. Репрессии должны закончиться, ведь таким способом власть все больше и больше порождает в сердцах людей злобу, ненависть и нетерпимость к действующему политическому режиму. Запугивание, ненависть и агрессия по отношению к людям — это не те методы, которые могут закрыть рот. Тирания и узурпирование — это не тот стиль руководства, который поможет долго сохранить власть. Нужен цивилизованный и человеческий способ. И это — уважение, любовь к своему народу и сердечное служение ему!!!

**Юлия КУЗНЕЦОВА,**
**педагог.**

*Минск.*

ПОДУМАЛОСЬ

# Люди «икс»

*В прошлом номере "Народной Воли" помещена фотография, на которой люди без опознавательных знаков, без униформы несут распятого "отмороженного". Это, на языке власти, человека, который иначе думает, который, видя беспредельщину, пытается как-то протестовать. И мне подумалось: вполне вероятно, что среди этих "носильщиков" могли быть и те, кто так же, не представляясь, хватал и тащил к машине Захаренко, Гончара, Завадского...*

**С уважением —**

**Н.Т.ЛАНДА,**
**житель Минска.**

ЗАЧАПІЛА

# Пазіцыя ці неадукаванасць?

*Днямі ў ранішні эфір канала АНТ быў запрошаны мастацкі кіраўнік Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Валерый Анісенка. Нагода была цікавая — тэатр ладзіць пленэрныя пастаноўкі на свежым паветры — пад Мінскам рыхтуецца пастаноўка спектакля па п'есе Чэхава "Дядя Ваня". Мяркую, што многім гледачам было цікава даведацца, што гэта за форма пастаноўкі і як трапіць на такі незвычайны спектакль.*

Але размова не тое што не чапляла, а нешта замінала слухаць дыялог паміж госцем Валерыем Анісенкам і вядучымі — Люцыяй Лушчык і Валерыем Кашчэевым. На хвіліне трэцяй я зразумела — Анісенка размаўляе пабеларуску, а вядучыя — па-руску. Прычым было відаць, што да сюжэту яны рыхтаваліся, Лушчык, перш чым задаць пытанне, падглядвала ў камп'ютар. Сюжэт суправаджаўся кадрамі з папярэдняй пастаноўкі тэатра на свежым паветры — чэхаўскай "Чайки".

Няўжо вядучыя не маглі з павагі да госця перайсці на тую мову, на якой размаўляў ён? А падругое, паказаць свой прафесіяналізм, адукаванасць, лёгка перайшоўшы на мову суразмоўцы?

Што гэта было — пазіцыя канала, які абраў толькі рускую мову? Ці неадукаванасць журналістаў? У любым выпадку ў нязручнай сітуацыі апынуліся яны. Бо і Лушчык, і Кашчэеў працуюць на тэлебачанні ў Беларусі, яны — беларускія журналісты. А Кашчэеў, падаецца, служыць яшчэ і ў Купалаўскім тэатры.

**Я.БЫЛІНСКАЯ.**

*Мінск.*

ВПЕЧАТЛЕНИЯ

# ...А цветы Жене мы все же возложили

Я хочу рассказать читателям "Народной Воли", как я провела вечер 22 июня 2011 года.

В первые дни войны пропал без вести в Лиепае брат моей бабушки Евгений Сергеевич Корзун. Всю жизнь его ждали родители, мои прабабушка и прадедушка. Всю жизнь его искала моя бабушка.

Уже не ждем, но мы, внуки и правнуки Евгения Сергеевича, продолжаем ходить по определенным датам на площадь Победы, чтобы положить цветы и поклониться нашему славному родственнику.

На этот раз автобус №100 почему-то не ходил, и от ГУМа мы отправились пешком. Нам удалось добраться только до "МакДональдса", что на углу улицы Ленина и проспекта Независимости. Мне показалось, что на этом перекрестке и в районе центральной площади собрались чуть ли не все жители города. Многие были с детьми в колясках, несли их на руках и вели за руку.

Поскольку протиснуться меж людей было невозможно, мы решили сесть на лавочку возле "МакДональдса" и переждать большой поток. Периодически на этот пятачок "десантировались" то какие-то группы "чернорубашечников" (кстати, без опознавательных знаков), то милиционеры в голубых рубашках. "Черные" жутко матерились, гнали людей к площади Свободы, потом вдруг начинали хватать всех подряд и грузить в автозак и автобусы. Видим, схватили паренька лет 16—17 и вместе с велосипедом погрузили в автозак. Если многие из молодых ребят хлопали в ладоши, то этот ничего подобного не делал, он просто проезжал мимо на своем хорошем велосипеде.

Надо отметить, что милиция в голубом вела себя прилично и адекватно. К присутствующим горожанам обращались строго вежливо, слушали людей, у них правильная речь. Правда, когда появились "голубые" со звездами на погонах и строем, человек 20—25, побежали по улице, это было трагикомичное зрелище. Практически всем из них необходимо носить бюстгальтеры и втягивающее корсетное белье, техника бега, простите, как у глубоких инвалидов. А в остальном, мне показалось, что милиция — с народом.

Была еще одна группа защитников власти — в штатском, они были чрезмерно опутаны в районе головы проводками и пружинками, вероятно, это были элементы питания мозга, так как эти "штатские" с нечеловеческой энергией орали в рации, а им из рации возбужденно вопили в ответ еще громче. Я разобрала только слова: "Жестче, еще жестче". Одновременно с криками "штатские" все время бегали: то запрыгнут на парапеты у подземного перехода, то вознесутся на лестницу "МакДональдса", то просто сучили ногами, тщательно вытаптывая травку и цветы на мини-газоне. Но истерично кричали они все время, вне зависимости от места дислокации.

Надо отметить, что все вышеперечисленные группы периодически окружали нашу лавочку, на которой сидело 8—10 человек, и требовали, чтобы мы ушли. Я, дама в летах, ростом 172 сантиметра и весом за центнер, предлагала особо настойчивым отнести меня в автозак. Мы отбили атаки по "зачистке" города и отстояли свое право сидеть на лавочке. Рядом с нами стоял паренек лет двадцати, красивый, стройный, умный. Когда к нему подбегали очередные "герои" от каких-то, возможно, карательных, органов, он, четко выговаривая слова, требовал у них: "Предъявите ваши дакументы!" Он повторял эту фразу "черным", "штатским", иногда у него звенел голос, и, наверное, ему тоже было страшно от фантасмагории, происходящей вокруг. Но он стоял, и у карателей всех разновидностей требовал предъявить документы. Это невероятно, но последние терялись и ретировались.

Я восхищена этим молодым человеком, спасибо ему за урок мужества и достоинства.

Время шло к 20.30, постепенно разъезжались переполненные автозаки. Возле церкви на площади Свободы надрывалась звукоусилительная аппаратура из автобуса, поскольку звук форсировался, идентифицировать произведения было невозможно. Улицы заметно обезлюдели, поперек тротуаров через 70—100 метров выстроились шеренги людей в черном. Нам не было страшно, но каждый раз, подходя к очередной шеренге "черных" с ошибкой в надписи на спине, я подсознательно ждала окрика: "Хальт! Хенде хох! Аусвайс!"

Шеренга, перегородившая улицу Ленина от общественной уборной в арке под "МакДональдсом" до проезжей части, была особенно взвинченной. Напомню, нас было трое, мы были с цветами. Самая длинная особь среди "черных" не позволила нам пройти. На вопрос "Почему?" ответила: "Потому что я вас ненавижу". Пытаясь выяснить причину ненависти ко мне лично, я стала перед ненавидящим, и мои глаза оказались на уровне его открывшейся пасти, а в ней — зеленовато-коричневые сгнившие огрызки бывших зубов. Я не буду живописать свои дальнейшие ощущения, сформулирую лишь несколько вопросов.

Из какого "питомника" выпускают на улицу этих особей?

Почему их не научат какому-нибудь языку, кроме мата, и каким-нибудь манерам, кроме хамства?

Почему в нашей стране в центре столицы бродят какие-то стаи "чернорубашечников", почему их научили только избивать и ненавидеть законопослушных людей?

...А цветы Жене мы все-таки положили. Нет, не на площади Победы, туда, оказалось, нельзя было подойти. Нам удалось возложить букет к танку, что возле Дома офицеров.

Вот так я провела вечер 22 июня 2011 года. Я поняла в те скорбные часы, что наш страх — это опора "черных" и их вожаков. Мне их стало пронзительно жаль — это же надо опуститься до такого уровня!

**О.В.ГРИБОВА,**
**просто минчанка.**

ТАКОЕ ЖЫЦЦЁ

# Грошы для сына

Вясна выдалася халодная, зацяжная. Наступіла другая палова красавіка, а цяпла ўсё не было. Старая Міхаліна Кунцэвіч, хата якой стаяла на самай ускраіне аграгарадка, пасля палудня з вялікай цяжкасцю ўскапала граду пад цыбулю. Пакуль працавала, было горача, а як станавілася передыхнуць, пранізлівы вецер студзіў спіну.

"Можа, заўтра Міша, як прыйдзе з працы, зробіць грады пад моркву і буракі, бо ўжо трэба сеяць", — думала з кволай надзеяй на сынаву дапамогу. Старая сумнявалася недарэмна, бо як і ў той дзень, так і назаўтра Міша прыйшоў п'яны. Не да градак яму. Ледзь прыцёгся ў хату і, як быў у вопратцы ды абутку, лёг на старую канапу ў верандзе, заснуў імгненна.

Міхаліну апанаваў адчай. Ды, прынамсі, адчай рэдка пакідаў яе з той пары, як тры гады таму Міша вярнуўся з Мінска, дзе меў і кватэру, і сям'ю. З работы звольнілі за п'янку, а жонка выперла з дому, так бы мовіць, без выходной дапамогі. І ён прыцёгся да старой маці і сеў на яе жабрацкую калгасную пенсію. Правалэндаўшыся два месяцы без справы, нарэшце ўладкаваўся ў мясцовую будаўнічую брыгаду. Але і адтуль неўзабаве папрасілі, бо хоць і ў той брыгадзе былі не прыхільнікі цвярозага ладу жыцця, аднак піць так, як Міша, не асмельваўся ніхто.

Потым ён падвозіў на ферму кармы, пасвіў кароў... Выганялі, зноў бралі, бо дзе ты знойдзеш у вёсцы працаздольнага чалавека, які з прагнасцю не глядзеў бы ў чарку. Вось і цяпер ён быў заняты на ферме, піў ледзь не штодня, і маці ў трывозе чакала, што не сёння-заўтра сына зноў прагоняць з работы.

Назаўтра раніцай Міша сам не пайшоў на ферму, бо пасля ўчарашняга было вельмі цяжка.

— Схадзі да суседкі Надзі Ступачыхі і папрасі, хай налье хоць паўшклянкі віна, ведаю, у яе заўсёды ёсць у запасе. Надта ж няможацца...

І шкадуючы сына, і праклінаючы яго ганебную цягу да алкаголю, Міхаліна пайшла да суседкі. Надзя пашкадавала не Мішу-п'яніцу, а старую, нямоглую маці, што пакутуе з-за яго.

— Можа, няхай бы ён на тую работу не хадзіў, цётка Міхаліна? — не то спытала, не то прапанавала суседка. — Бо якая ж карысць? Калі сам не дабяжыць да віна ці самагонкі, то сябрукі нальюць. Каб сядзеў дома, то, можа, так бы не піў...

— Праўду кажаш, Надзечка! — як за выратавальную саломінку схапілася за гэтую думку Міхаліна. — Неяк пражывём на маю пенсію. Ды і так на яе жывём, бо ўсё, што заробіць, тут жа прап'е. А так неўзабаве лета, у лесе будуць ягады, грыбы. Збяру, здам, усё ж нейкую капейку зараблю. Дзякуй табе, Надзечка, і за віно, і за параду.

Схаваўшы пад крысо фуфайкі паўлітровы слоічак, у які суседка наліла шклянку віна, старая пайшла дадому.

За прапанову не хадзіць на работу, а жыць на мацярынскую пенсію Міша ўхапіўся адразу. Надта ж абрыдлі пастаянныя папрокі начальства ды звальненніўладкаванні. Проста ў пячонках сядзела такое жыццё. А раз маці сама кажа: "Будзь дома, неяк пражывём", — то ён толькі за.

Як ні дзіўна, але, звольніўшыся з работы, Міша і сапраўды перастаў піць. Ён вынес з куратніка гной, перакапаў увесь агарод, паправіў плот ад выгану. Штодзень Міхаліна прыдумвала яму нейкую работу, каб забыўся пра спіртное, думкі ў галаве з'явіліся іншыя, талковыя.

Улетку, калі ў лесе паспелі чарніцы, старая з самай раніцы паволі ішла ў ягаднікі, якія ведала як свае пяць пальцаў, і да вечара назбірвала ледзь не паўнюткае вядро. Стамлялася так, што ногі ледзь перастаўляла, але вельмі радавалася, што заўтра надвячоркам па вёсцы зноў будзе ездзіць нарыхтоўшчык і яна здасць ягады, атрымае жывую капейку. А як жа яна была патрэбна ў хаце, гэтая капейка! Мішу хацела купіць новыя туфлі, бо старыя парваліся, і кашуля яму патрэбна была. А ёй лекі, бо галава часта балела, сэрца нібы хто абцугамі цiснуў... Ды і на ежу яны трацілі нямала, свайго ж нічога не трымалі, акрамя курэй. Яна таму, што ўжо не магла, бо ўвосень павінна споўніцца 80 гадоў, а сын па іншай вядомай прычыне.

Такіх, як Міхаліна, здабытчыкаў ягад у лесе было нямала. Усе старыя, ды і малодшыя кабеты, дзеці, што не раслі пустадомкамі, днявалі ў лесе. Чарніцы былі добра-такі абабраны, чарнічнік вытаптаны. Іншы раз даводзілася ісці далёка ад вёскі, але старую не спынялі ніякія цяжкасці: яна зарабляла грошы для сына. Дома іх не пакідала, баялася, што Міша знойдзе і прап'е. Насіла ў насовачцы за пазухай, завязаўшы ў тугі вузялок.

У той гарачы летні дзень, калі Міхаліна, як і заўсёды, была ў ягадах, паштальёнка Каця Русіч, прынесла пенсію.

— Заўтра прыйду, раз няма гаспадыні, — сказала яна Мішу, што ляжаў у садзе пад старой яблыняй.

— І ахвота табе па дзесяць разоў бегаць? — ляніва пацягнуўся ён. — Мне давай, я ж цяпер не п'ю.

— Можа, і праўда аддаць? — уголас разважала Каця. — Толькі ж глядзі, каб ні рубельчыка не распусціў, а то мне сорамна будзе цётцы Міхаліне ў вочы глядзець.

— Ды клянуся! — сеў пад яблыняй Міша, з нейкай шалёнай радасцю гледзячы, як паштальёнка адлічвае купюры, дастае з сумкі ведамасць, каб распісаўся.

Не паспела Каця на сваім ровары праехаць і паўкіламетра, як Міша ледзь не подбегам кінуўся да магазіна: столькі грошай ён не трымаў у руках ужо даўно! Набраў віна, закускі і гукнуў сябрукоў Віцьку Жуніча і Толю Маркевіча, што мучыліся пахмеллем на лаўцы ля магазіна:

— Пайшлі! Я частую!

Старая Міхаліна выбралася з ягадніку, калі ўжо браўся прыцемак. Сёння ёй не пашанцавала: і набрала мала, і галава так балела, што нямілы быў белы свет. Яна села на паваленую ветрам сухастоіну, каб хоць крыху перавесці дух, і раптам абсунулася долу: інсульт, нібы стрэл, забіў напавал...

Сын, які то піў, то пахмяляўся, нават і не заўважыў, што маці не прыйшла дадому дзве ночы і два дні. Толькі на трэці дзень, калі прыехала паштальёнка Каця, пацікавіцца ў цёткі Міхаліны, ці аддаў ёй Міша пенсію, ён успомніў, што маці няма. І ўчора не было..

Каця пазваніла ў міліцыю. Участковы сабраў людзей на пошукі няшчаснай Міхаліны.

Яе знайшлі ў той жа дзень. Ляжала ля сухастоіны з пачарнелым тварам, не падобная да сябе самой. А побач валялася перакуленае вядро, з якога высыпаліся чарніцы, і з-за пазухі вываліўся вузельчык з грашыма для сына...

**Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.**

*Дзятлаўскі раён.*

СТРАТА

# Яна з годнасцю насіла сваё імя — Ефрасіння

З вялікім душэўным болем не толькі я, а і ўсе мае сябры ў беларускамоўным асяроддзі пачулі горкую вестку аб спачыне светлага чалавека, выдатнага педагога і навукоўцы, доктара педагагічных навук, прафесара Ефрасінні Георгіеўны Андрэевай. Гэта незвычайная, духоўна багатая жанчына родам з Сібіры, руская па нацыянальнасці, больш за паўстагоддзя таму апынулася ў Беларусі. І не толькі вывучыла беларускую мову, але і палюбіла яе як сваю, бездакорна на ёй размаўляла, выкладала ў Дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка і пісала выдатныя публіцыстычныя артыкулы аб выхаванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, змаганні за іх вольную, дэмакратычную будучыню. Многія з тых яе артыкулаў і дагэтуль у памяці чытачоў "Народнай Волі".

Вялікая страта спасцігла нашу культуру і навуку, якім яна прысвяціла сваю плённую навуковую дзейнасць. Хрышчаная пры нараджэнні імем Ефрасінні, а ў 30-я гады, з-за пераследу іх кулацкай сям'і змушаная жыць пад чужым імем, сваё сапраўднае яна вярнула з прыездам на Беларусь, нябесная заступніцай якой з'яўляецца святая Еўфрасіння Полацкая — вялікая асветніца і падзвіжніца на асветніцкім шляху. Спадарыня Ефрасіння Андрэеўна годна насіла гэтае імя, стаўшы гарачай патрыёткай нашай зямлі, актыўным дзеячам нацыянальнага Адраджэння.

На працягу апошніх гадоў, калі Ефрасіння Георгіеўна цяжка хварэла і была прыкавана да ложка, побач з ёю быў і падзяляў яе пакуты верны спадарожнік па жыцці — знаны вучоны, доктар гістарычных навук, прафесар і проста выключна сардэчны і мужны чалавек Леанід Міхайлавіч Лыч. Прыміце, калі ласка, глыбокапаважаны Леанід Міхайлавіч, глыбокае спачуванне з прычыны непапраўнай страты дарагога чалавека. Гэта, паверце, і наш смутак, і наша вера, што светлы след Ефрасінні Георгіеўны не знікне на гэтай зямлі.

**Са смуткаваннем —**

**Б.БАРОВІЧ,**
**жыхар Маладзечна.**

ПАМЯЦЬ

# Дарога смерці

*26 чэрвеня споўнілася 70 гадоў з дня жудаснага расстрэлу вязняў Беразвецкай турмы ў вёсцы Мікалаева Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці.*

Турма ў Беразвеччы была створана пасля ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі. Такіх турмаў было шмат, і траплялі туды не злачынцы, а звычайныя людзі, якія займалі нейкія пасады пры польскай уладзе і таму выклікалі падазрэнне савецкай улады ў сваёй нелаяльнасці. Сярод іх былі настаўнікі і ўрачы, леснікі і жаўнеры, святары і іх родныя, а ў большасці — простыя рабочыя і сяляне. Лагер праглынуў і знявечыў тысячы людскіх лёсаў.

Калі пачалася вайна, была арганізавана тэрміновая эвакуацыя вязняў на ўсход. Калона пад узмоцненай аховай рухалася пешшу, толькі канваіры і іх сем'і ехалі на падводах. За два дні змучаныя гарачынёй, смагай, голадам і цяжкім доўгім шляхам мужчыны і жанчыны дайшлі да Улы. Пасля таго як калона перайшла па мосце Заходнюю Дзвіну, у небе з'явіўся нямецкі самалёт. Напэўна, яго мэтай быў аэрадром, што знаходзіўся на суседнім полі, ці сама пераправа, але скопішча людзей не магло не прыцягнуць увагу пілота. Зямля здрыганулася ад выбухаў некалькіх скінутых бомбаў. Гэтага аказалася дастаткова, каб начальнік канвою прыняў рашэнне пазбавіцца ад сваіх падахоўных і ратаваць сваю шкуру. Ён не баяўся распараджацца жыццямі людзей, бо, напэўна, ужо ведаў пра сакрэтнае распараджэнне Панамарэнкі і Цанавы, якое прадпісвала пры немагчымасці аховы зняволеных... знішчыць.

Людзям загадалі легчы на брук тварам уніз і метадычна пачалі расстрэльваць безабаронных. Параненых дабівалі штыкамі. Кроў залівала дарогу і прыдарожныя канавы. Толькі некалькі чалавек змаглі ўцячы. Не хапае слоў, каб перадаць увесь жах і адчай гэтай трагедыі.

Пасля таго як сціхлі апошнія енкі і стогны, канваіры заняліся пахаваннем. Сабралі мясцовых жыхароў з падводамі. На ўскрайку лесу на пясчаным ўзгорку, дзе зімой у ямах захоўвалі насенную бульбу, загадалі выкапаць траншэі. На падводы грузілі па дзесяць трупаў і выкідвалі іх у траншэі ўсіх разам, нахіляючы падводу.

У 1942 годзе немцы, магчыма, па просьбах людзей, якія шукалі сваіх родных, правялі эксгумацыю пахаваных. Зноў жа капаць загадалі мясцовым жыхарам. Па іх сведчаннях, тады былі перазахаваны 800 трупаў, але большасць магіл засталіся нераскапанымі. Дакладная колькасць ахвяр не ўстаноўлена і да сёння.

Мясцовыя жыхары, напалоханыя жудасным расстрэлам і перадваенным хапуном, калі ў кіпцюрах ГПУ раптоўна знікалі іх сваякі і суседзі, баяліся нават успамінаць трагедыю, сведкамі якой яны былі. Вайна, разруха і голад прыглушылі памяць. Я нарадзілася і вырасла ў суседняй вёсцы Кардон, але ніколі нічога не чула аб тых падзеях. Вось толькі ў той лес мы ніколі не хадзілі ні па ягады, ні па грыбы. Маці казала, што там "дрэнны лес".

Першыя звесткі пра расстраляных палякаў (палякамі называлі ўсіх жыхароў Заходняй Беларусі) з'явілася напрыканцы васьмідзясятых у эпоху галоснасці. Успаміны жывых сведкаў былі надрукаваны ў Шумілінскай раённай газеце, а потым з'явіўся артыкул У.Нарушэвіча ў часопісе "Полымя" (№3, 1990 год). Пазней на месцы пахавання з дапамогай палякаў быў створаны сціплы мемарыял, на якім надпіс зроблены на польскай і на беларускай мовах. Над сімвалічнай турэмнай сцяной высока пад самыя сосны ўзняўся каталіцкі крыж. Каталіцкія вернікі і святары апякуюцца над гэтым пахаваннем і штогод у гадавіну гібелі бязвінных ахвяр праводзяць Святую імшу, моляцца аб тым, каб Бог даў супакой іх душам. Прыязджаюць на месца трагедыі і сваякі пахаваных.

Сёлета мемарыял наведала першая каталіцкая пілігрымка з Віцебска. Памяць расстраляных ушанавалі і актывісты недзяржаўных грамадскіх арганізацый з розных куткоў Віцебшчыны, да якіх далучыліся прадстаўнікі стварaемай партыі БХД з Мінска. Былі ўскладзены вянкі і жывыя кветкі, запалены свечкі, прагучалі супольныя малітвы ў памяць пахаваных і за тое, каб ніколі такое не паўтаралася на нашай зямлі, каб не гінулі бязвінныя людзі, каб праз пакаянне і памяць прыйшло ачышчэнне. З надзеяй і верай прысутныя праспявалі малітвугімн "Магутны Божа".

**Валянціна ГРАКУН.**

*Бешанковічы.*

Народная Воля http://www.nv-online.info
8 ЛІПЕНЯ 2011 г.

КОРАТКА

## Аб уз'яднанні Кіпра

Генеральны сакратар ААН Пан Гі Мун правёў у Жэневе перамовы з лідарамі грэчаскай і турэцкай супольнасцяў Кіпра аб уз'яднанні гэтага раздзеленага на дзве часткі вострава.

Паміж імі захоўваюцца вялікія супярэчнасці ў пытаннях уласнасці, па вяртанні жыхароў, выгнаных са сваіх дамоў...

## Пры сутыкненні поезда з аўтобусам...

На поўначы Індыі поезд сутыкнуўся з аўтобусам. У выніку загінула больш за 30 чалавек. Усе яны ехалі з вяселля. Аварыя адбылася на чыгуначным пераездзе.

## Больш за дваццаць чалавек забіты ў сірыйскім горадзе Хама

Яны забіты ў ходзе ваеннай аперацыі па падаўленні антыўрадавых выступленняў. Такія дзеянні ўлад асудзіла арганізацыя "Міжнародная амністыя". Яна заклікае Савет бяспекі ААН вынесці гэтае пытанне на разгляд Міжнароднага суда.

## На барацьбу з ліхачамі

Еўрапейскі Саюз збіраецца навесці парадак на дарогах і павысіць бяспеку. Еўрапарламент адобрыў дырэктыву, накіраваную на барацьбу з ліхачамі, якія беспакарана парушаюць правілы руху за межамі сваёй краіны. Цяпер інфармацыя аб іх парушэннях будзе перадавацца па месцы іх жыхарства, з тым каб яны неслі пакаранне.

## Згубілі мільён еўра

Адбылося гэта ў Баварыі. Па папярэдняй версіі, у інкасатарскай машыне выпадкова адкрыліся дзверы і вываліліся грошы. Выратаваў інкасатараў ад адказнасці 41-гадовы салдат, які знайшоў грошы і прынёс іх у паліцыю.

## Дарагое вяселле

Вяселле князя Манака Альбера ІІ і паўднёваафрыканкі Шарлен Уітсток абышлося казне ў 20 мільёнаў еўра. Аб гэтым паведаміў кіраўнік урада Манака Мішэль Рожэр.

## Несла мужа ў чамадане

Мексіканская жанчына спрабавала вынесці з турмы свайго мужа ў чамадане пасля спаткання. Яна ўжо дабралася да асноўнага выхаду, але ахоўнікі звярнулі ўвагу на тое, што жанчына ледзь цягне вялізную сумку на калёсіках. Адкрылі яе і ўбачылі асуджанага, на якім былі толькі трусы і шкарпэткі.



## Самы вялікі ў свеце лагер для бежанцаў

**Самалійцы чакаюць сваёй чаргі для атрымання прадуктаў харчавання ў лагеры для бежанцаў Дадааб на тэрыторыі Кеніі. Гэта самы вялікі ў свеце лагер для бежанцаў. Ён быў пабудаваны для 90 тысяч чалавек. Але вымушаны быў прыняць у чатыры разы болей.**

КОММЕНТАРИЙ

# Почему Кремль грозит НАТО?

В ходе заседания Совета Россия—НАТО президент Дмитрий Медведев пригрозил альянсу выйти из исторического договора о сокращении вооружений, в случае если сторонам не удастся прийти к единому мнению относительно натовской системы ПРО.

При этом, пишет SPIEGEL ONLINE, глава Североатлантического альянса Андерс Фог Расмуссен припас приветливые слова для хозяина встречи в российском Сочи Дмитрия Медведева. Генсек НАТО уверил своих российских партнеров в том, что Брюссель надеется на более тесные и дружественные отношения с Москвой, вплоть до стратегического партнерства.

Позиция российской стороны, замечает обозреватель Беньямин Биддер, была более жесткой. В преддверии встречи российские СМИ сообщали о неком ультиматуме, который Кремль якобы собирается выдвинуть альянсу. Как отмечает немецкий комментатор, речь идет в целом о двух спорных моментах в отношениях между Москвой и Брюсселем. Россия и НАТО не могут договориться о военной операции в Ливии, однако более весомым является недовольство российской стороны по вопросу размещения элементов натовской системы ПРО на территории Восточной Европы. Россия продолжает подозревать Запад в том, что предполагаемые объекты будут нацелены не против Ирана или Северной Кореи, а против российских Вооруженных сил.

Россия требует от альянса гарантий безопасности — как с точки зрения договоров, так и чисто технического плана. Пока на требования Москвы Брюссель не соглашается.

Москва опасается, что противоракетный щит в Европе — всего лишь начало более массированного расширения системы ПРО в свете желания США, ведущей силы в НАТО, сделать свою территорию полностью неуязвимой. Если щит будет оснащен в таком ключе, гигантский ядерный арсенал Москвы окажется бесполезным. Таким образом, — резюмирует журналист, — Россия потеряет свой "заклад", который позволяет ей сегодня разговаривать с Америкой на равных.

Во внутренней пропаганде у России к НАТО гораздо более жесткий подход, и в интервью Радио Свобода президент Института стратегических оценок Александр Коновалов объясняет, почему: "*У нас надвигается предвыборная кампания. И в ней хороши любые аргументы*". Возможно, после личного общения генсека НАТО с Дмитрием Медведевым тон в разговоре с Брюсселем Москва несколько снизит, но для внутреннего потребления Североатлантический альянс все равно остается внешней угрозой. И чем меньше времени остается до выборов, тем больше в российском эфире разговоров про коварство НАТО.

ВЗГЛЯД

# Будущее все равно принадлежит Америке

Эксперты твердят, что настал час упадка Америки, что XXI век будет принадлежать какой-то другой стране, замечает на страницах The Wall Street Journal Уолтер Расселл Мид, профессор Бард-Колледжа. "*Парализованный внутренними долгами, истерзанный последствиями финансового кризиса, обескровленный долгими войнами на Ближнем Востоке, американский Атлант больше не в силах держать небо. Как Великобритания до нас, Америка направляется в дом престарелых для отставных мировых держав*", — излагает он эту точку зрения.

"*Но эта болтовня, вошедшая в моду, — полное заблуждение",* — заявляет автор. Да, у США колоссальные проблемы, а нынешнему мироустройству бросают вызов новые державы. "*Но США уникальны не своими проблемами. Сегодня всякая крупная страна столкнулась с экстраординарными вызовами*", — пишет автор. На его взгляд, США лучше всех приспособлены для того, чтобы извлечь выгоду из шансов XXI века и противостоять его угрозам.

По поводу прогноза, что Китай вскоре бросит вызов американскому господству в мире, автор пишет, что в современной Азии на подъеме не только Китай, но и Индия, а Вьетнам, Южная Корея, Тайвань, Индонезия и Австралия бурно развиваются и не собираются попадать под влияние Китая. Азия — многополярный регион, который не сможет контролировать ни одно государство в одиночку. "Это полностью отвечает интересам США. США не заинтересованы ни во власти над Азией, ни в помехах экономическому росту, который идет на благо всему Тихоокеанскому бассейну, в том числе нашей его части", — пишет автор.

По его мнению, других реальных соперников у США в мире нет: "*Даже европейцы перестали толковать о ЕС как о крепнущей сверхдержаве*". Столкновение западной и исламской цивилизаций автор считает крайне маловероятным, а у России "*демографический спад и плохие экономические перспективы (не говоря уже о ее обеспокоенности исламистским радикализмом и усилением Китая)".*

В мире идей американская идеология тоже является всемирной для XXI века, считает автор. Фашизм мертв, как и Франко. Коммунистическая идеология теплится в Северной Корее и еще кое-где, но не возрождается, исламизм в ходе "арабской весны" занимает маргинальное положение. *"Мечта сплотить Южную Америку в великий антикапиталистический, антиамериканский блок столь же мертва, как Че Гевара",* — пишет Мид.

Но главное, что на Америку работает глубокая тенденция мирового развития — ускорение перемен во всех аспектах человеческой жизни. *"Научные и технические революции дают толчок экономическим, социальным и политическим потрясениям. Промышленность мигрирует по миру в молниеносном и ускоряющемся темпе. Сотни миллионов человек с беспрецедентной скоростью переселяются в города. Средства связи ежегодно дешевеют, а их спектр расширяется*", — повествует автор. Женщины требуют равноправия, граждане восстают против монархов. Каждая фирма, каждая семья должны научиться выживать.

"*Все почувствуют стресс, но США лучше всех приспособлены для того, чтобы оседлать волну перемен",* — пишет автор.

ЛЮБОПЫТНО

## *Зарплата главы МВФ*

Кристин Лагард на посту главы Международного валютного фонда (МВФ) будет получать 467,9 тысячи долларов ежегодно, плюс 83,760 тысячи для поддержания "уровня жизни, подобающего должности", пишет британская газета The Guardian. Зарплата главы МВФ будет расти вместе с инфляцией.

Кристин Лагард получила инструкции по поводу соблюдения "высоких стандартов этического поведения": речь идет о принципах "честности, беспристрастности и рассудительности". "*Вы должны стремиться избегать любых проявлений неуместности в Вашем поведении",* — инструктирует МВФ своего главу. Лагард также должна пройти курс этики.

Как пишет газета, в ноябре 2007 года, когда Доминик Стросс-Кан был назначен главой МВФ, никаких требований соблюдать нормы этического поведения к нему не предъявлялось. Вместо этого от главы МВФ требовалось избегать конфликта интересов или возможности возникновения такого конфликта.

А КАК У НИХ?

## *Непозволительно президенту ездить на дорогой машине, когда уровень жизни в стране низкий*

Президент Филиппин Бениньо Акино на специально созванной пресс-конференции объявил, что продал свою машину Porsche 911, отдав ее за 104 тысячи долларов.

Как сообщает агентство Reuters, спорткар несколько месяцев не давал покоя гражданам страны. Не помогло президенту даже то, что за автомобиль он заплатил из собственного кармана, а сама машина 2007 года выпуска попала к нему из третьих рук.

Однако рейтинг главы государства неуклонно падал, а опросы общественного мнения показывали, что примерно половина сограждан Акино считали, что непозволительно президенту покупать спортивную машину, когда уровень жизни в стране низкий, а цены все время растут.

До покупки Porsche, ради которой Акино даже взял кредит в банке, он ездил на стареньком BMW, который не вызывал раздражения у населения.

СТАЛО ИЗВЕСТНО

# *Великобритания разрабатывает кибероружие*

*"Действия в киберпространстве станут частью будущего театра боевых действий", — сказал в интервью газете Ник Харви, британский министр вооруженных сил. По его словам, кибероружие не вытеснит традиционное, но является "неотъемлемой частью арсенала страны". "Это первое официальное признание существования такой программы", — пишет издание.*

Информация о характере разрабатываемого оружия по-прежнему строго засекречена, но, по некоторым сведениям, работами руководят Секретариат кабинета министров Великобритании и Центр кибербезопасности при Штаб-квартире правительственной связи, а со временем подключится министерство обороны. Министерство недавно назначило генерала Джонатана Шоу главой группы по кибербороне.

В прошлом году в стратегии национальной обороны Британии кибербезопасность была объявлена первостепенной задачей, на ее нужды изыскали дополнительные 650 млн фунтов. Последствия атак на виртуальную инфраструктуру могут быть катастрофическими, подчеркнул Харви. "В случае ядерного или биологического оружия технический порог высок. Если речь идет о кибероружии, палец, зависший над клавишей, может быть и пальцем государственного деятеля, и пальцем студента", — заявил министр.

Харви не уточнил, откуда могут исходить будущие угрозы, но рекомендовал: "Глупо думать, будто Запад сможет всегда диктовать темп и направление кибертехнологий".

Со своей стороны, генерал Грэйм Лэмб, экс-директор спецназа Великобритании, сказал в интервью, что требуются еще более радикальные действия — следовало запретить министерству обороны концентрировать ресурсы в сфере более традиционной доктрины обороны. Новые угрозы намного смертоноснее, а вероятность их использования намного выше, современные технологии позволяют одиночке наносить удары, которые прежде были исключительной прерогативой государств, заявил Лэмб.

СТИЛЬ ЖИЗНИ

# Что делают немцы в обеденный перерыв?

*С того момента, как вы пришли в офис, прошло четыре часа. Живот начинает тревожно ворчать, и чувство голода мешает сосредоточиться на работе... Пора в столовую? Однако святые для каждого трудолюбивого сотрудника обеденные минуты хочется провести с максимальной пользой не только для желудка, но и для души. Что можно успеть в Германии за обеденный перерыв?Об этом рассказывается на сайте "Немецкой волны".*

## Расслабиться и подышать

"Мы начинаем-м-м-м... Успокаиваемся... Медленно опускаемся на пол... Ладошки обращены к небу... С каждым вздохом уходит напряжение..." Расслабляющие напевы Сюзанны Хипель, владелицы йога-студии в центре Бонна, заменяют некоторым немецким бизнес-леди полноценный обед. Блестящий паркет, белые стены, яркие коврики и слегка дурманящий аромат. Согласитесь, неплохая альтернатива галдящей столовой? За часик экспресс-йоги можно успеть глубоко и правильно подышать, разогреться и "проработать" те части тела, которые обычно каменеют в офисном кресле, то есть шею, спину и ноги.

"Обычный сеанс йоги длится около полутора часов. Естественно, на обеденное время мы оставляем лишь часть комплекса упражнений. Но ведь лучше сделать хотя бы что-то, чем совсем ничего", — говорит Сюзанна.

Традиция заниматься йогой в обеденный перерыв пришла в Европу из США. Сегодня помимо йоги во время ланча конторские работяги могут попробовать и другие оздоровительные тренировки. Причем сделать это можно даже в собственном офисе всем рабочим коллективом. Стоит лишь найти помещение посвободнее и пригласить инструктора. "Тем, кто хочет заняться йогой, нужны всего лишь спортивный костюм, футболка и теплые носки. Их спокойно можно сложить в сумку и взять с собой на работу. Все остальное у нас есть: коврики, подушки, покрывала и специальные ремни для занятий", — рассказывает Сюзанна Хипель.

## Соленое погружение

Теплая соленая вода и полная темнота. Медленная музыка сменяется оглушительной тишиной. Нерешенные вопросы и проблемы испаряются без следа. Кожа разглаживается, боли исчезают, мысли приходят в порядок...

Полный сеанс стоит в среднем 45 евро и длится около часа. Плюс несколько минут стоит оставить на то, чтобы принять душ и смыть соль с тела. "Если обеденный перерыв не позволяет так долго нежиться в ванной, сеанс можно сократить, — говорит Карин Беккер, хозяйка массажного салона в Бонне. — Но надо помнить, что расслабление всегда сопровождается усталостью. Хотя некоторые клиенты, напротив, после процедуры чувствуют сильный прилив энергии".

## Массаж to-go

Что такое coffee to-go, сегодня знают многие. И удобно, и быстро: взял картонный стаканчик с кофе — и в путь. По аналогии с этим массажные салоны Европы внесли в свое меню новый пункт "массаж to-go". Особенность этой процедуры в ее продолжительности, точнее — в непродолжительности: всего 20—30 минут на массажном кресле или в руках профессионала. Понежиться в обеденный перерыв на массажном кресле стоит около 15 евро. Еще одна "примочка" для трудоголиков — мобильный массаж. Так же, как и йоги, массажисты выезжают в офисы и разминают косточки ударникам труда практически без отрыва от производства.

Массажист из Йены Камилло Альстер рассказывает, что в обеденный перерыв на одном предприятии он успевает размять спины восьми или даже десяти сотрудникам. "Если в западной части Германии эта услуга пользуется спросом уже давно, то любители офисного массажа на востоке страны появились лишь в последние несколько лет", — рассказывает Камилло.

Что ж, после такого обеденного перерыва можно гордо вскинуть голову, вспомнить об осанке и отправиться на покорение карьерных высот.

**Наталия ЛАЗАРЕВА.**



## *Балет на вакзале*

**Балерына зачаравала пасажыраў мадрыдскага вакзала "Аточа" сваім танцам з балета "Шчаўкунчык".**

ЯНЫ — ПРА НАС

## *На мяжы катастрофы*

Польская газета „Rzeczpospolita" піша, што беларуская эканоміка на мяжы катастрофы. Адзіны ратунак — дапамога з Масквы, як гэта было раней, дзякуючы чаму афіцыйны Мінск мог утрымліваць нерэфармаваную эканоміку. Беларускія ўлады і надалей хочуць гэта рабіць.

## *Кансультацыі ў Страсбургу*

Палітычная сітуацыя ў Беларусі стала адной з тэм нефармальных кансультацый, якія правялі ў Страсбургу міністр замежных спраў Украіны, старшыня Камітэта міністраў Савета Еўропы Канстанцін Грышчанка, генеральны сакратар Савета Еўропы Тарб'ёрн Ягланд і вярхоўны прадстаўнік ЕС па пытаннях знешняй палітыкі і бяспекі Кэтрын Эштан.

СЛЫШАЛИ?

## *Сверхсекретная «Зона-51»*

В Пакистане никто — ни на земле, ни в ПВО — не обнаружил новое творение "Зоны-51", пока оно наблюдало за усадьбой бен Ладена в Абботтабаде в ночь штурма, отмечает Independent. По интернету ходят дикие слухи, что на этой сверхсекретной авиабазе США в Неваде спрятаны несколько НЛО. *"Но эта "игрушка" была не НЛО, а новейшим беспилотником",* — пишет журналист Марк Пайсинг.

Данный беспилотник дальнего действия — серый, с крыльями, как у летучей мыши, незаметный для радаров — прозвали "Кандагарским зверем". Его официальное название RQ-170 Sentinel.

*"Зона-51" была важнейшим объектом холодной войны, ее создали, чтобы обогнать СССР в сфере науки",* — отмечает журналистка Энни Джейкобсен, автор книги "Зона-51": история без цензуры". *"Сегодня объект делает то же дело — конкурирует со всеми, кого Америка считает врагами, будь то Северная Корея, Иран или Китай*", — добавила Джейкобсен.

У "Зоны-51" есть одна странная особенность: даже во времена WikiLeaks оттуда нет утечек информации, отметила Джейкобсен. Между тем база находится всего лишь в 90 милях от Лас-Вегаса.

ЭЎРЫКА!

## *На дно Ціхага акіяна*

У свеце назіраецца дэфіцыт так званых рэдказямных элементаў. Асноўныя залежы іх у Кітаі. Аж 97 працэнтаў там здабываюць іх. Нядаўна гэта краіна заявіла, што абмяжуе экспарт названых элементаў. А яны ж неабходны пры вытворчасці электронікі.

Такая навіна моцна занепакоіла японцаў, асноўных вытворцаў згаданай тэхнікі. Яны пачалі шукаць выйсце і знайшлі на... дне Ціхага акіяна. Каля Гавайскіх астравоў яны адшукалі вялікія залежы рэдказямных элементаў і металаў.

Геолаг Такійскага ўніверсітэта Ясухіра Като тлумачыць, што дастаткова накачаць помпамі прыдонную гліну на караблі і апрацаваць яе тут шляхам кіслотнага вышчалачвання. За некалькі гадзін з гліны можна атрымаць 80—90 працэнтаў рэдказямных элементаў.

КУЛУАРЫ

# Званне народнага артыста гарантуе 105 тысяч беларускіх рублёў і месца на Маскоўскіх могілках

*Напрыканцы чэрвеня вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы* ***Віктар Манаеў*** *быў узнагароджаны ганаровым званнем "Народны артыст Беларусі".*

*У гэты ж дзень афіцыйна "народнай" стала актрыса Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі* ***Таццяна Мархель****, а артыст* ***Ігар Сігаў*** *з РТБД атрымаў "заслужанага".*

*"Народная Воля" пацікавілася, якія бонусы атрымалі артысты разам з ганаровымі званнямі.*



Народны артыст Віктар Манаеў і заслужаны артыст Сяргей Журавель.

— Народны артыст Беларусі і Савецкага Саюза **Генадзь Аўсяннікаў**, як і ўсе народныя артысты Беларусі, атрымлівае за званне 105 тысяч беларускіх рублёў — на сённяшні дзень гэта прыкладна 20 долараў, — *сказаў "Народнай Волі" мастацкі кіраўнік Купалаўскага тэатра, лаўрэат Дзяржпрэміі* ***Мікалай Пінігін***. — Яшчэ кожнаму народнаму артысту гарантавана месца на Маскоўскіх могілках.

Таму і не ідуць цяпер так масава, як раней, у артысты і рэжысёры — не прэстыжна гэта. Бо вяршыня тваёй кар'еры — 20 долараў і гарантаванае месца на прэстыжных могілках...

Як па мне, дык я адмяніў бы гэтыя званні! Чалавеку, вядома, прыемна, але... Лепш не ганьбаваць сябе, чым вось так ацэньваць працу народных артыстаў, якіх у нас, можа, тры-чатыры дзясяткі набярэцца ад сілы... Гэта ўжо нават не смешна. Гэта нейкая пародыя...

Прычым працэдура атрымання звання — архіскладаная! Мы два ці тры гады на **Віктара Манаева** дакументы падавалі на званне. Мы рыхтавалі паперы, нам іх вярталі як няправільна афармленыя, затым трэба было з нейкімі "гаркамамі-райкамамі" ўсё ўзгадніць, з нейкімі людзьмі, якія ад нараджэння ў тэатры не былі! Хіба гэта нармальна?.. Гэта зневажальная працэдура...

Што тычыцца звання заслужаных артыстаў, то тут такая гісторыя: у кожным тэатры ёсць пяцідзесяцігадовыя (і старэйшыя) акцёры і актрысы, якія ў гэтым узросце ўжо мала запатрабаваныя. Гэта натуральны працэс. Але яны пражылі добрае тэатральнае жыццё. А па ўсіх гэтых палажэннях аб прадстаўленнях да званняў мы павінны даць звесткі аб іх ролях за апошнія тры гады, прычым ролі павінны быць значнымі! Дык давайце тады званні заслужаных маладым, якія да 30 гадоў выконваюць сто роляў у спектаклях. Дайце ім! А так атрымліваецца, што калі чалавек усё жыццё ў тэатры адпрацаваў, а цяпер менш іграе, то ён звання ўжо і не заслугоўвае. Хоць ён заслужыў яго ўсім сваім жыццём у тэатры! Дурная логіка — як быццам бы званне даецца за дасягненні сённяшняга або ўчарашняга дня...

Я не ведаю, як са званнямі ў мастакоў, але ў тэатры вось так...

Жыццё жабрацкае, і артыстам, безумоўна, патрэбны хоць такія цацкі ў выглядзе званняў. Але ні розуму, ні грошай яны не дадаюць...

Вось прэмія Саюзнай дзяржавы, на якую намінаваны наш спектакль "Вяселле", — там каля 120 або 160 тысяч долараў. Гэта я разумею — прэмія, прыемна, адчувальна.

Калі я Дзяржпрэмію за "Тутэйшых" атрымаў (мы ўпяцярых атрымалі), то ў маім эквіваленце гэта была скрыня гарэлкі. А на ўсіх — цэлыя пяць скрынь гарэлкі. Гэта было ў 90-я гады, у цяжкія часы...

А сёння званні трэба даваць альбо вельмі рэдкім людзям (але тады і матэрыяльны складнік павінен быць сур'ёзным), альбо... адмяняць зусім. Інакш растлумачыце — які сэнс у гэтых званнях?..

ПА-ЗА СЦЭНАЙ

# Увага: адшукваюцца інтэлігентныя бізнесмены, якія любяць тэатр!

*На пачатку сакавіка Савет Міністраў зацвердзіў амаль рэвалюцыйнае "Палажэнне аб апякунскай радзе арганізацыі культуры". Калі коратка, то, стварыўшы такую раду, кожны тэатр альбо музей можа разлічваць на прыцягненне пазабюджэтных сродкаў на ўласныя патрэбы. Прычым апекуны могуць выдаткоўваць грошы на што заўгодна.*

*"Напрыклад, апякунская рада, якая працуе ў Санкт-Пецярбургскім БДТ, — вельмі сур'ёзная структура, якая нават кватэры артыстам будавала бясплатна, — распавядаў у мінулым годзе нашай газеце Мікалай Пінігін. — І кармілі бясплатна ў тэатры. Прычым не толькі артыстаў — усіх. Гэта справа прэстыжу".*

*"Народная Воля" пацікавілася ў вядомага рэжысёра, ці выстраіліся каля Купалаўскага тэатра чэргі беларускіх бізнесменаў, якія хочуць падтрымаць грашыма Святлану Зелянкоўскую, Юлю Шпілеўскую, Тамару Міронаву ці яшчэ каго альбо прафінансаваць новую пастаноўку Аляксандра Гарцуева ці Паўла Харланчука.*



— У нас быў спіс з 30 банкаў і сур'ёзных арганізацый, уключаючы "Амкадор", — *распавёў Мікалай Пінігін*. — У выніку грошы на фестываль вылучыў толькі "Беларусбанк" — два мільёны беларускіх рублёў.

Прычым усё гэта было яшчэ да крызісу...

Мне здаецца, пакуль дзяржава не прадаставіць падатковых ільгот для тых, хто ўкладвае грошы ў культуру, мала што зменіцца. Спорт і культура фінансуюцца ва ўсім свеце прыватнымі асобамі. Калі чалавек інтэлігентны і адукаваны і хоць трохі разумее, што такое нацыянальны тэатр, ён можа дастаць што-небудзь са сваёй кішэні і даць нам. А ва ўсіх астатніх выпадках — толькі рацыянальны падыход. Бізнесменам павінна быць выгадна ўкладваць грошы ў культуру. Гэтыя людзі павінны нейкі свой інтарэс бачыць...

Таму, шчыра кажучы, я пакуль не ведаю, дзе іх узяць, гэтых апекуноў...

Напрыклад, у тым жа Вялікім тэатры ў Маскве апякунскі савет нават сварыўся з **Анастасіяй Валачковай**. Яны разборкі з ёй ладзілі — там сур'ёзны бізнес, які разбіраецца ў оперы, балеце, які ездзіць на сусветныя прэм'еры ...

**— Хочаце сказаць, што ў нас такіх прадстаўнікоў бізнесу няма?**

— Можа, і ёсць, але іх няшмат...

Вельмі цяжка знайсці чалавека з грашыма, які б разумеў, што такое нацыянальная культура, тэатр. Груба кажучы, патрэбен інтэлігентны чалавек у бізнесе. Напэўна, такія ўсё-такі ёсць...

Не выключана, што калі мы атрымаем новы і прыгожы тэатр, хто-небудзь з заможных людзей выкупіць сабе ложу, будзе запрашаць туды сяброў...

Апякунскі савет у БДТ, дзе я працаваў, узначальваў Сабчак. І ўвесь бізнес быў там. **Валянціна Матвіенка** таксама праз прэм'еру ў тэатр хадзіла. Гэта знак для бізнесу...

**— Дазвольце яшчэ адно пытанне пра грошы. Да крызісу артысты Купалаўскага ўслых скардзіліся, што з іх заробкам ні крэдыт узяць, ні жыллё пабудаваць. Сёння нешта змянілася ў лепшы бок?**

— Да мільёна, мільён у лепшым выпадку, атрымліваюць. Нягледзячы на тое, што ў нас фінансаванне больш, чым у іншых тэатрах, на зарплату гэта ніяк не распаўсюджваецца. Я вось зараз **Паўла Харланчука** на месяц адпусціў на здымкі — разумею, што яму дзяцей трэба карміць...

Сёння зарабіць грошы ў тэатры немагчыма. Зарабляць трэба ў іншых месцах — у кіно, яшчэ недзе. Тэатр у нашай краіне — гэта хобі, захапленне...

БУДОЎЛЯ

## *Мільёны долараў на святло і гук*

*Мікалай Пінігін і жартам і ўсур'ёз кажа: маўляў, не так даўно толькі даведаўся, што людзі, аказваецца, ходзяць у тэатр не толькі на спектаклі, але і на будынак паглядзець...*

Гендырэктар Купалаўскага тэатра **Павел Палякоў** сцвярджае, што рэканструкцыя тэатра *"ідзе па плане".*

"*Мы плануем у верасні наступнага года вярнуцца ў свой будынак*, — кажа Палякоў. — *Ёсць маса праблем з праектным інстытутам, але яны вырашаюцца. Пакуль, паўтараю, усё ідзе па плане*".

Насамрэч будоўля — не самая вялікая праблема, з якой прыйдзецца сутыкнуцца адміністрацыі Купалаўскага, адзначаюць эксперты. Хутчэй за ўсё будынак тэатра здадуць у тэрмін, праблем з фінансаваннем, нягледзячы на крызіс, паўстаць не павінна — праз дарогу ад Купалаўскага знаходзіцца працоўная рэзідэнцыя прэзідэнта... Больш важнае пытанне, якое яшчэ трэба будзе вырашыць, — набыццё светлавога і гукавога абсталявання. А гэта — мільёны долараў ці еўра. Але гэта — пытанне заўтрашняга дня...

ПРЭМ'ЕРЫ

## *«Выкраданне Еўропы, альбо Тэатр Уршулі Радзівіл»*

*У гэтым сезоне Пінігін прэзентаваў "Нясвіжскую арлекінаду ў 2-х дзеях" — спектакль, пастаўлены паводле п'ес княгіні Францішкі Уршулі Радзівіл, заснавальніцы прафесійнага тэатра на Беларусі.*

*Па вялікім рахунку, гэтае прадстаўленне — рэканструкцыя святочнага вечара ў Нясвіжскім замку, дзе гасцей забаўлялі танцамі, спевамі, камедыямі. Усё гэта прысутнічае ў спектаклі, які складаецца з трох частак — балета "Дасціпнае каханне", оперы "Выкраданне Еўропы" і камедыі "Распуснікі ў пастцы".*



— Я хачу, каб людзі ведалі, на які спектакль ідуць, каб разумелі, што да чаго, — *гаворыць Мікалай Мікалаевіч*. — Лічу, што ўсім нам трэба пазбаўляцца ад свядомасці беларусаў як нацыі, у якой, акрамя лапцяў і ручнікоў, нічога не было...

Было!

Тэатр Уршулі Радзівіл — гэта быў хатні замкавы тэатр. Мы паспрабавалі зрабіць рэканструкцыю таго, што магло адбывацца ў Нясвіжы. Сказаць, што ў сярэдзіне XVIII стагоддзя побач з Мінскам на землях старой Літвы існаваў аматарскі тэатр, які ўжываў барочную эстэтыку, дзе былі балеты, камічныя оперы. І гэты тэатр быў уключаны ў сусветны працэс. Гэта такое брутальнае сармацкае барока...

*Дарэчы, ролю Еўропы ў гэтым спектаклі выконвае* ***Юлія Шпілеўская*** *(на здымку). Яе вакальныя здольнасці высока ацаніў заслужаны артыст Беларусі і педагог* ***Віктар Скарабагатаў*** *— сказаў, што асабліва Шпілеўскай удаліся класічныя спевы...*

## *«Паўлінка» стане сувенірнай*

*Да новага тэатральнага сезона Купалаўскі рыхтуе адразу некалькі прэм'ер — "Ноч на Каляды" паводле Мікалая Гогаля і "Людзі на балоце" паводле Івана Мележа.*

— Напрыканцы кастрычніка я зраблю "Ноч на Каляды", — *дзеліцца планамі Пінігін*. — **Аляксандр Гарцуеў** прапанаваў паставіць "Людзі на балоце". Мы вырашылі, што гэта павінен быць спектакль пра каханне...

Што тычыцца "Ночы на Каляды", то я яго ставіў у Пецярбургу. У БДТ білеты на яго каштавалі 100 еўра, і на яго немагчыма было трапіць! Думаю, такі спектакль патрэбны і ў нашым рэпертуары.

Тэатральны сезон 2012 года мы павінны распачаць ужо ў новым будынку — плануем адкрыцца "Паўлінкай". Я збіраюся аднавіць гэты спектакль. Але гэта зусім не азначае, што я збіраюся ўмешвацца ў рэжысуру (спектакль быў пастаўлены пасля вайны) — проста хачу прывесці яго ў парадак: аднавіць касцюмы, дэкарацыі, зрабіць яго такім музейным сувенірам, таму што сучаснага сэнсу ў "Паўлінцы" я не бачу ніякага...

## *Тэндэнцыі часу*

*Палову сваёй хатняй бібліятэкі Мікалай Пінігін падараваў Тэатральна-мастацкай акадэміі. Ён лічыць, што многія класічныя рэчы і нават той жа Ібсэн больш ніколі не будуць запатрабаваныя.*

— Увогуле, мне падаецца, што мы знаходзімся на парозе глабальных змен чалавечай свядомасці, — *дзеліцца сваімі прадчуваннямі Пінігін.* — Я нядаўна вярнуўся з чэхаўскага фестывалю — туды чацвёрты год запар прывозяць балеты. Адны балеты — сучасныя, класічныя і гэтак далей. Пластыка і музыка — гэта тое, што не падуладна часу. Старыя рэчы — Астроўскі, Горкі — ужо не працуюць. Гэта як быццам ужо жаваная гума. Цяпер над чалавецтвам павешаны купал — у нас блакіраваная свядомасць, мы не здольныя шукаць новае, а старое ўжо не працуе... Гэта адчуваюць усе. Гэта тэндэнцыя, гэта не я прыдумаў...

**Марына КОКТЫШ.**

## *Мастацтва на рамонце*

*Нядаўна давялося пачуць пра тое, што выдаткаваныя дзяржавай сродкі на рамонт галоўнага будынка Дзяржаўнай акадэміі мастацтваў былі адкліканы, а таму ўсе працы спыніліся. Па каментарый "Народная Воля" звярнулася да рэктара БДАМ* ***Міхася Баразны****.*

— Сапраўды, такі эпізод, звязаны з рамонтам будынка, быў, — *патлумачыў рэктар Акадэміі.* — Але ён тлумачыўся выключна тэхнічнымі нюансамі, пры гэтым працы не спыняліся. Яны працягваюцца і цяпер. Згодна з праектам, усе выдзеленыя сродкі на рамонт правага крыла галоўнага будынка акадэміі павінны быць засвоены да канца года. Пасля гэтага мы чакаем выдзялення сродкаў на працяг рамонту, цяпер — левага крыла будынка. Гэтыя працы павінны пачацца ўжо ў наступным годзе.

Паводле нашых звестак, рамонту цяпер падлягаюць тыя плошчы, якія раней займала аддзяленне, дзе рыхтуюць акцёраў тэатра і кіно ўключна з тэатральнай залай. У сувязі з гэтым заняткі з будучымі акцёрамі адбываліся па-за межамі іх альма-матар. Тым не менш уступныя экзамены на права вучыцца ў БДАМ пачнуцца дакладна ў вызначаны тэрмін. І рамонтныя працы гэтаму аніяк не перашкодзяць.

**Дзмітрый ПАДБЯРЭЗСКІ.**

АНОНС

## *«Канцэрт на траве» ўзначаляць «У нескладовае» і Vinsent*

*16 ліпеня на хутары Шаблі адбудзецца другі open-air "Канцэрт на траве". У фэсце жывой музыкі і добрага настрою сярод маляўнічых лугоў возьмуць ўдзел гурты "У нескладовае", Vinsent, The Silicon, Akute.*

Хутар Шаблі знаходзіцца на маляўнічых лугах у 80 км ад Мінска і добра вядомы аматарам беларускай музыкі дзякуючы штогадоваму этна-фэсту "Вольнае паветра". Ідэя "Канцэрта на траве" належыць **Ганне і Лявону Вольскім.** Першы міні-фэст паспяхова адбыўся на пачатку чэрвеня і арганізатар **Уладзімір Шаблінскі** вырашыў зрабіць яго штомесячным.

*"Маленькія фэсты на некалькі соцень гледачоў зараз з'яўляюцца моднай тэндэнцыяй для адпачынку, бо дазваляюць паслухаць добрую музыку ў прыгожым месцы і ва ўтульнай атмасферы. Пры гэтым мы забяспечваем цывілізаваны сэрвісны мінімум — гарачае харчаванне, прыбіральні і магчымасць для кемпінга, таму жадаючыя могуць застацца на ноч ці дзве са сваімі намётамі",* — адзначыў ён.

АНОНС

## *Владимир Стельмашонок: слово о Беларуси*

*В Национальном художественном музее проходит выставка одной картины народного художника Беларуси Владимира Ивановича Стельмашонка "Слово о Беларуси".*

На известной картине Стельмашонка изображены выдающиеся деятели белорусской национальной истории и культуры: Евфросиния Полоцкая, Кирилл Туровский, Франциск Скорина, Симон Будный, Петр Мстиславец, Симеон Полоцкий, Франтишек Богушевич, Кастусь Калиновский, Алоиза Пашкевич (Тетка), Максим Богданович, Якуб Колас, Янка Купала, Тишка Гартный, Владислав Голубок.

Владимир Стельмашонок создал эту композицию почти 40 лет назад, и она до сих пор остается классикой благодаря органическому сочетанию монументальности с глубиной и многозначностью смысла.

Автор соединяет в картине черты различных видов искусства — станкового полотна, монументальной росписи или шпалеры, плаката. Применяет гротеск, не теряя при этом портретной точности, тем самым переводя образы почти в символы. Сдержанный колорит холста, который воспроизводит в памяти рушники с их белым фоном и красками орнаментов, делает особенно отчетливыми лица персонажей.

У ТЭМПЕ ВАЛЬСА

# Першы танец: 4 парады для «чайнікаў»

*Шлюбны танец — выдатная і прыгожая традыцыя. Як зрабіць яго адметным і не ператварыць першы танец у першы блін?*

*Парады ў гэтай далікатнай справе "Народнай Волі" давала выкладчык клуба парных танцаў "Хастл" Юлія Ізвольская.*



### Парада першая. *Упэўніцеся ў жаданні*

Калі заява ўжо ляжыць у загсе, спіс гасцей падрыхтаваны, а шлюбная сукенка вісіць у шафе, надыходзіць час дакладна прадумаць такі доўгачаканы дзень. А якое ж вяселле без першага шлюбнага танца? На жаль, не кожны з нас мае выдатныя здольнасці да пластычнага руху, а таптанне на адным месцы пасярод залы пад музыку з чарговай "рамантычнай калекцыі" наўрад ці створыць патрэбную атмасферу і ўразіць запрошаных. Безумоўна, можна "забіць" на ўсё і станчыць як атрымаецца. Для не такіх адважных клуб парных танцаў "Хастл" прапануе свае паслугі. Але перад тым, як аддавацца ў рукі трэнера, суразмоўца "Народнай Волі" **Юлія Ізвольская** параіла ўзважыць усе за і супраць. Напрыклад, прадумайце, у якім стылі будзе ваша вяселле. Калі вы прытрымліваецеся рамантычных традыцый, то не варта танчыць пад хіп-хоп, няхай вы і любіце гэты напрамак.

*"Два гады таму я магла з упэўненасцю сказаць, што самы папулярны вясельны танец — вальс,* — прызналася "Народнай Волі" Юлія. — *Часта выбіраюць проста павольную кампазіцыю ці любімую песню. Сёння пары любяць ставіць "танцы з сюрпрызам", калі задзейнічаны розныя стылі, мяняецца музыка. Такія танцы глядзяцца як паўнавартаснае шоу".*

### Парада другая. *Рыхтуйцеся адказна*

Калі вы вырашылі зрабіць свой танец непаўторным, падлічыце, ці стасуецца гэта з вашым бюджэтам. **Адзін індывідуальны занятак з харэографам каштуе каля 10 долараў**. Можна абысціся і меншай крывёю. І выбраць экспрэс-курс, калі вас навучаць асновам танца ў групе ўсяго за 6 заняткаў. Кожны варыянт мае свае станоўчыя і адмоўныя бакі. Напрыклад, займаючыся з іншымі парамі, адразу прызвычайваешся да публікі, затое толькі падчас індывідуальнай адработкі вы зможаце ўдасканаліць свой танец і зрабіць яго ўнікальным.

*"Працягласць заняткаў залежыць ад таго, наколькі складаны танец і як доўга ён будзе цягнуцца,* — распавяла Юлія. — *Калі кампазіцыя доўжыцца прыкладна 1 хвіліну 45 секунд і танец пад яе не вельмі цяжкі, то можна справіцца за 5 заняткаў. Даўжэйшыя песні і складанейшыя танцы патрабуюць каля 9 заняткаў".*

Варта заўважыць, што людзі, якія прапануюць вам стварыць унікальны шлюбны танец літаральна за некалькі гадзін, хутчэй за ўсё маюць невялікае ўяўленне аб харэаграфіі. Чым больш пара будзе адпрацоўваць элементы, тым лепш яны будуць глядзецца на вяселлі. Безумоўна, займацца можна і дома, але хто выправіць вашыя памылкі?

### Парада трэцяя. *Не саромцеся*

Не бойцеся забыцца на некаторыя элементы танца і не кідайцеся ў плач, калі на вяселлі вы саб'яцеся ў складаны момант. Акрамя вас, ніхто дакладна не ведае, што вы падрыхтавалі. Дый і ніхто не будзе асуджаць вас за адсутнасць батманаў ці балетных падтрымак. Калі танец будзе ў радасць вам самім, то госці проста не заўважаць недарэчнасцяў і, хто ведае, магчыма, далучацца да танца.

*"Часцей за ўсё на танцполе не вельмі ўпэўненыя ў сабе маладыя людзі,* — прызналася Юлія Ізвольская. — *Тут галоўнае не намагацца схапіць зорку з неба, а ставіць танец па сваім ўзроўні. Бывае, што дзяўчаты, якія ў дзяцінстве займаліся танцамі, патрабуюць ад сваіх кавалераў немагчымага. Падрыхтоўка да вяселля і так вымагае даволі шмат высілкаў і нерваў, каб яшчэ і сварыцца з-за першага танца".*

### Парада чацвёртая. *Д'ябал у дробязях — сачыце за ўсім*

Выбраўшы музыку, паставіўшы танец, не палянуйцеся апрабаваць яго на месцы будучых падзей.

*"Вельмі важна адпрацаваць танец у шлюбным абутку,* — адкрывае сакрэты Юлія. — *Нявеста павінна хадзіць на ўсе рэпетыцыі ў абутку, максімальна набліжаным да шлюбнага, а жаніх абавязкова павінен паспрабаваць патанцаваць у вясельных туфлях.*

*Што тычыцца адзення, то я рэкамендую нявесце правесці некалькі рэпетыцый у споднях спадніцы, калі сукенка на абручах. Бывалі выпадкі, калі дзяўчаты прыносілі з дому просціны і прывязвалі іх на манер шлейфа. А вось жаніхам няблага накінуць свой пінжак, каб упэўніцца, што танцаваць у ім зручна і прыгожа".*

Калі ўсе дробязі будуць улічаны, у дзень вяселля вам не будзе аб чым хвалявацца.

ЗАМЕСТ ПАСЛЯСЛОЎЯ

## *Не горш, чым у людзей*

*Клуб парных танцаў "Хастл" за 10 год працы стварыў унікальныя харэаграфічныя кампазіцыі больш як для 400 пар. Часам працаваць прыходзілася з высокапастаўленымі жаніхамі і нявестамі.*

Стварыць для сябе індывідуальны танец можа любая пара, якая знойдзе час і грошы на заняткі з харэографам.

*"Я ўпэўнена, што і нашы зоркі любяць ставіць для сваіх святаў танцы, але, напэўна, выбіраюць іншых харэографаў,* — падзялілася Юлія. — *Затое нашымі паслугамі карысталіся дочкі некаторых міністраў. Былі і дзеці вельмі забяспечаных бізнесменаў".*

Пакуль мы размаўлялі з Юліяй, свой вясельны нумар адпрацоўвала яшчэ адна пара. **Ксенія і Аляксандр** рыхтуюцца да свята ў французскім стылі. Музыка адпавядае тэматыцы — вальс з кінафільма "Амелі". Пара ўжо выйшла на фінішную прамую, да іх вяселля засталося ўсяго некалькі тыдняў. І нявеста, і жаніх не шкадуюць, што аддаліся ў рукі харэографаў.

*"Мы займаліся паўтара месяца,* — прызналіся нам будучыя маладажоны. — *Вучымся танцаваць больш для сябе, чым для гасцей. Хочацца, каб усё было вельмі прыгожа. Дарэчы, мы яшчэ не бачылі фільм "Амелі", але музыка нас зачаравала".*

**Марыя МАЛЕВІЧ.**

Народная Воля
http://www.nv-online.info
8 ЛІПЕНЯ 2011 г.

**ВЕРНІСАЖ**

## У Музеі прыроды — электронны гід

У Музеі прыроды з'явілася новая паслуга — усім жадаючым даецца магчымасць праслухаць экскурсію з аудыёгідам.

Турыстам на выбар прапануецца экскурсія на адной з чатырох моў — рускай, англійскай, нямецкай або французскай.

Варта заўважыць, што ўваходны квіток у Музей прыроды для дарослага каштуе 7000, для дзяцей — 3500. За паслугі экскурсавода прыйдзецца заплаціць 25.000, а за аўдыёгіда — 13.000.

## Прастора Тудора Збырня



Па 18 ліпеня ў Нацыянальным мастацкім музеі таксама працуе выстава "Архетыпальная прастора" малдаўскага мастака, гендырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Малдовы **Тудора Збырня.**

## «Італія, айчына натхнення...»

13 ліпеня ў Нацыянальным мастацкім музеі ў рамках выставы рускага жывапісу з фондаў музея "Італія, айчына натхнення..." адбудзецца музычны вечар. У праграме творы А.Вівальдзі, А.Маргело, В.Беліні, Дж.Расіні, М.Глінкі, А.Варламава, А.Шнітке і іншых.

Праект прадстаўляюць: Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Беларуская Дзяржаўная філармонія, Музычная гасцёўня Таццяны Старчанка.

**ШТО? ДЗЕ? КАЛІ?**

# 9—17 ліпеня

## МІНСК

### Тэатры

**Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы**

***З 13 па 19 ліпеня Купалаўскі тэатр з'язджае на гастролі. Праўда, не за мяжу, а ў Брэст.***

На сцэне Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы будуць прадстаўлены спектаклі "Пінская шляхта" Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і "Вячэра з прыдуркам" Франсіса Вебера ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка тэатра Мікалая Пінігіна, "Каханне ў стылі барока" Яна Стэльмаха ў пастаноўцы Барыса Уторава, "Чорная панна Нясвіжа" Аляксея Дударава ў пастаноўцы Валерыя Раеўскага, "Офіс" Інгрыд Лаўзунд у пастаноўцы Кацярыны Аверкавай, а таксама найстарэйшы спектакль тэатра — славутая "Паўлінка" Янкі Купалы ў пастаноўцы Льва Літвінава.

**Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі**
11 — "Сонечка".
13 — "Палёты з анёлам".
14 — "Нязваны госць".
15 — "Сталіца Эраўнд".

**Тэатр-студыя кінаакцёра**
10 — "Ограбление в полночь".
11 — "Поле битвы".
12, 13 — "Очень простая история".
14, 15 — "Как выходят в люди, или На всякого мудреца довольно простоты".
16, 17 — "№13".

**Беларускі дзяржаўны музычны тэатр**
10 — "Веселая вдова".
11 — "Голубая камея".
12 — "Аршин Мал Алан".
13 — "Бабий бунт".
14 — "Кармен-сюита. Дивертисмент из балета "Щелкунчик".
17 — "Однажды в Чикаго".

**Нацыянальны акадэмічны тэатр імя М.Горкага**
10 — "Правда — хорошо, а счастье лучше".
12 — "Идеальный муж".
13 — "Единственный наследник".
14 — "Мнимый больной".
15 — "Распутник".
16 — "Свободный брак".

**Беларускі дзяржаўны маладзёжны тэатр**
14 — "Сыграем в дружную семью".

**Тэатр Беларускай арміі**
12, 13 — "Собака на сене".

**Канцэртная зала "Мінск"**
11 — "Мой бедный Марат", спектакль з удзелам **Аляксандра Дамагарава і Андрэя Ільіна.**
12 — "Бог", у галоўнай ролі — модны артыст **Гоша Куцэнка**.

### Канцэрты

**Малая зала імя Р.Шырмы**
12 — AVENIR-BAND "ОПЯТЬ ПРО ЛЮБОВЬ" "В JAZZе только дедушки".
14 — Ансамбль салістаў Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі.

**Мірскі замак**
9, 10 — Міжнародны фестываль сярэднявечнай культуры "Наследие веков".

## БРЭСТ

**Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы**
12 — "Играем в семью, или Гарнир по-французски".
13, 17 — "Пінская шляхта".
14 — "Каханне ў стылі барока".
15 — "Паўлінка", "Молодожены".
16 — "Чорная панна Нясвіжа".

**Брэсцкі тэатр лялек**
10 — "Чебурашка".
17 — "Доктор Айболит".

**Брэсцкая філармонія**
9, 10 — Цырк-шапіто "Арэна" з міжнароднай праграмай "Сузор'е".

## ВІЦЕБСК

**Нацыянальны драматычны тэатр імя Я.Коласа**
10 — "Во всем виновата собака".
11 — "Фердинандо".

**Беларускі тэатр "Лялька"**
9 — "Брэменскія музыкі".
10 — "Прынцэса і Свінапас".
11, 14 — "Загубленая душа, або Пакаранне грэшніка".
12, 13 — "Дэкамерон".

**Віцебская абласная філармонія**
9 — "Анна Снегина", спектакль Тэатра-студыі кінаакцёра.
11 — "Фестываль без межаў", Даўгаўпілскі камерны аркестр (Латвія).
12 — Вечар вакальнай музыкі.
13 — Вечар раманса ў выкананні **Яўгеніі Смальянінавай** (Расія).

## ГРОДНА

**Гродзенскі абласны тэатр лялек**
10 — "Красная Шапочка".

**Гомельская абласная філармонія**
9 — Летнія вечары ў музеі.
10 — Міжнародны фестываль гумару "ГРОДНО-МОСКВА-ТРАНЗИТ".

**АНОНС**

## Премьера запланирована на сентябрь

*Театр оперы и балета планирует открыть новый, 79-й, театральный сезон премьерой. На 9 и 11 сентября в Большом запланирована премьера — "Севильский цирюльник".*

В театре говорят, что "Севильский цирюльник" — один из тех знаковых для белорусского театра оперы и балета спектаклей, с которым связано становление национального оперного искусства. Его история началась на сценах Белорусского музыкального техникума (1927) и Белорусской студии оперы и балета (1930) под руководством знаменитого русского певца Антона Боначича.

Этот спектакль был второй после "Евгения Онегина" постановкой, осуществленной в 1942 году эвакуированной труппой оперы на сцене Горьковского театра оперы и балета им. А.С.Пушкина, где с большим успехом исполнялся вплоть до отъезда наших артистов.

Новую версию "Севильского цирюльника" ставит **Михаил Панджавидзе**.

## ГОМЕЛЬ

**Гомельскі абласны драматычны тэатр**
13, 14 — "Недосягаемая".
15, 16 — "Синтезатор любви".
17 — "Любовная авантюра".

**Гомельскі гарадскі маладзёжны тэатр**
10 — "Ход конем".
12 — "Рождение".
13 — "Верная жена".
15 — "Ночь Гельвера".
17 — "Ужин с дураком".

**Гомельская філармонія**
14 — "Залатыя галасы Беларусі" **Наталля Акініна** (меццасапрана), **Таццяна Старчанка** (фартэпіяна).

## МАГІЛЁЎ

**Магілёўскі абласны драматычны тэатр**
12 — "С любовью не шутят!".
13 — "Полоумный Журден".
14 — "Пижама для шестерых".

**Магілёўскі тэатр лялек**
12 — "Крылья Дюймовочки".
14 — "Веселые медвежата".
19 — "Пчелка Зуза".

## ПОНЕДЕЛЬНИК, 11 ИЮЛЯ

### Первый

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 15.00, 19.00, 00.15** "Новости".
**06.05, 07.10, 08.15** "Доброе утро, Беларусь!".
**07.05, 08.05, 18.50, 01.15** "Зона X".
**07.30, 08.25, 11.50** "Деловая жизнь".
**08.30** "Горожане: Афины".
**09.10, 19.55 "Маргоша".** Сериал.
**10.05** "Славянский базар" в Витебске-2011".
**10.15** "Жизнь как жизнь".
**11.05, 18.00 "Маруся. Возвращение".** Сериал.
**12.15 "А я люблю женатого".** Худ.фильм.
**13.50** "Синематека".
**14.30** "Nota Bene".
**15.20, 19.20** "Новости региона".
**15.40** "Здоровье".
**16.05** "Требуется".
**16.20** "Звездная жизнь".
**17.10 "Маршрут милосердия".** Сериал.
**19.30** "Зямля беларуская".
**21.00** "Панорама".
**21.35** "Командировка".
**21.50**"Славянский базар" в Витебске-2011".
**22.00** "Славянский базар" в Витебске-2011". Конкурс исполнителей эстрадной песни "Витебск-2011". День первый.
**00.25 "Доктор Хаус-5".** Сериал.
**01.20** "День спорта".

### ОНТ

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** "Наши новости".
**06.05** "Наше утро".
**09.05** "Контуры".
**10.10** "Смак".
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** "Новости спорта".
**11.10 "Любительница частного сыска Даша Васильева".** Сериал.
**11.55** "Детективы".
**12.30** "Живая природа: прямой репортаж".
**13.10** "Контрольная закупка".
**13.45** "Модный приговор".
**14.50** "Понять. Простить".
**15.25** "Хочу знать" с Михаилом Ширвиндтом".
**16.15 "Обручальное кольцо".** Сериал.
**18.20 "Счастливы вместе".** Сериал.
**18.55** "Жди меня".
**20.00** "Время".
**21.05 "Хиромант. Линии судеб".** Сериал.
**22.10 "Атлантида".** Сериал.
**23.05** "Последний челнок Америки".
**00.00 "Крем".** Сериал.
**00.45** "Ночные новости".

### РТР-Беларусь

**07.00** "Утро России".
**09.20** "Комната смеха".
**10.20** "Утренняя почта".
**10.55** "Погода на неделю".
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00, 23.30** "Вести".
**11.30, 18.55 "Ефросинья".** Сериал.
**12.20, 16.20 "Кулагин и партнеры".** Сериал.
**12.50** "Вольф Мессинг. Первый советский экстрасенс".
**13.50, 16.50, 19.50, 23.20** "Новости — Беларусь".
**14.30** "О самом главном".
**15.25** "С новым домом!".
**17.30** "Городок".
**18.00 "Пять минут до метро".** Сериал.
**20.30 "Цвет пламени".** Сериал.
**22.15 "Смерть шпионам!".** Сериал.
**23.55** "Славянский базар-2011".

### НТВ-Беларусь

**07.00** "НТВ утром".
**08.35** "Кулинарный поединок".
**09.35, 15.35, 18.35** "Обзор. Чрезвычайное происшествие".
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.05** "Сегодня".
**10.20** "Русские сенсации".
**11.10** "До суда".
**12.00** "Суд присяжных".
**13.25 "Супруги".** Сериал.
**15.10** "Дело вкуса".
**16.30 "Возвращение Мухтара".** Сериал.
**18.10** "Чистосердечное признание".
**19.35 "Москва. Три вокзала".** Сериал.
**21.20 "Час Волкова".** Сериал.
**23.30** "Наказание. Русская тюрьма вчера и сегодня".
**00.25** "Один день. Новая версия".

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** "24 часа".
**06.10, 17.20** "Минщина".
**06.20, 07.45** "Утро. Студия хорошего настроения".
**07.40, 20.10, 22.55** "СТВ-спорт".
**08.30** "Неделя".
**09.35** "Большой завтрак".
**10.05** "Зеленый огурец. Полезная передача".
**10.40 "Наши соседи".** Сериал.
**11.45, 17.30** "Званый ужин".
**12.35** "Большой город".
**13.10** "Дальние родственники".
**13.50** "Звездный ринг".
**15.00** Концерт Михаила Задорнова.
**16.00** "Я — путешественник".
**16.50** "Репортерские истории".
**17.10** "Наше дело".
**18.30 "Огонь любви".** Сериал.
**20.00** "Столичные подробности".
**20.15** "Добрый вечер, малыш!".
**20.25 "Отдаленные последствия".** Худ.фильм.
**23.00** "Столичный футбол".
**23.30** "Тайны мира".

### ЛАД

**07.00** "ЛАДное утро".
**08.00, 14.15, 21.15** "Новости погоды".
**08.05, 17.55 "Ты — моя жизнь".** Сериал.
**09.00, 19.00 "Журов".** Сериал.
**10.00** "Альбарутения".
**10.25** "Лабірынты".
**10.55** "Женсовет".
**11.25** "Дети нового поколения".
**12.25 "Летние впечатления о планете Z".** Худ.фильм.
**13.35** "Маша и медведь". Мультсериал.
**13.50** "Пра мастацтва".
**14.45** "Реальный мир".
**15.10** "Час суда. Дела семейные".
**16.15** "Врачебные тайны".
**16.45** "Врачебные тайны +".
**17.00, 23.25** "Битва экстрасенсов".
**20.00** "Белорусское "Времечко".
**21.00** "Калыханка".
**21.20** "КЕНО".
**21.25 "Парни побоку".** Худ.фильм.
**00.20** "Реальный мир".

### Мир

**05.00, 06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 15.00, 17.00, 18.00, 21.00, 22.00, 23.00, 00.00, 01.00** "Новости Содружества".
**05.05** "Миллион вопросов о природе".
